Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

РАБОТНІЦА і КАЛГАСНІЦА

БЕЛАРУ

№ 3

1935 г.

УЗМАЦНІМ САНІТАРНУЮ АБАРОНУ

Узмацненне санітарнай абароны—асноўная мэта кожнага мерапрыемства таварыства Чырвонага Крыжа.

Частка райкомаў Чырвонага Крыжа сапраўдна па-большэвіцку ўключыліся ў вытворчы паход імя з'ездаў советаў. Шляхам соцспаборніцтва і ўдарніцтва ўнутры пярвічных арганізацый дабіліся наступных вынікаў у рабоце:

На ф-цы «Окцябр» (Менск) санпастамі абгледжана рабочых кватэр—392, падрыхтаваны да здачы норм «ГСО» (гатоў да санітарнай абароны)—40 чалавек, навучаецца — 150. Завербавана членаў 650 чалавек, сабрана членскіх узносаў—200 руб. Наладжана работа 23 санпастоў. Цэх імя Чырвонага Крыжа з'яўляецца перадавым па ўсіх паказальніках. Выканаў прамфінплан за 1934 год на 104,2 проц. Лепшымі цэхарганізатарамі Чырвонага Крыжа з'яўляюцца таварышы Шварцберг, Дзіміна і Фішкін. Курсы медсясцёр спаборнічаюць з курсамі медсясцёр фабрыкі «Комунарка» на лепшую якасць вучобы. Да XVII гадавіны Чырвонай арміі камітэтам Чырвонага Крыжа ўзят абавязак выпусціць 35 значкістаў ГСО. Уся работа праводзіцца пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі фабрыкі «Окцябр». Работа Чырвонага Крыжа асвятляецца ў фабрычным друку. Старшыня камітэта Чырвонага Крыжа тав. Спектар.

На 15 жактах горада Віцебска арганізавана ваенна-тэхнічная вучоба, якой ахоплена 173 жанчыны. Выпуск гурткоў і 100 значкістаў ГСО намечаны да XVII гадавіны Чырвонай арміі. Паміж жактамі і асобнымі санпастамі заключаны соцумовы на лепшае наведванне заняткаў, лепшае асваенне вучобы, на прыкладную чыстату кватэр, на 100 проц. ахоп членствам і зборам членскіх узносаў.

Лепшыя актывісткі Чырвонага Крыжа тав. Колжанкова, Вясёлая, Яўсеева і другія.

На шчотачнай фабрыцы ў Гомелі праведзены тры сансуботнікі па ўсім цэхам. Па ініцыятыве актывістак Чырвонага Крыжа па цэхам набыты ўмывальнікі, мыла, выціральнікі. Ахоплена членствам 100 проц. рабочых. Праводзяцца гутаркі на саназдаравіцельныя тэмы па ўсім цэхам. Ліквідавана запазычанасць па членскім узносам. Створан цэх імя Чырвонага Крыжа, які штомесячна перавыконвае прамфінплан, даючы 110 проц. Пры фабрыцы арганізован сангурток. Выпушчаны дзве насценгазеты. Здалі норму на значок ГСО 35 чалавек. Наведванне заняткаў сандружыны 90 проц.

Пры калгасе «Будаўнік», Любаньскага раёна, працуюць два санпасты. Актыў Чырвонага Крыжа калгаса ўключыўся ў культпаход. Праверана санстановішча калгасных хат, малочнай фермы, студняў. Апошнія прыведзены ў лепшае санстановішча. Ліквідавана запазычанасць па членскім узносам. Начсанпаста—лепшая калгасніца Пулак Маня.

Работа лепшых, перадавых камітэтаў, якія па-сапраўднаму пераключылі сваю работу па ўзмацненню санабароны краіны, па ўнядрэнню санітарна-культурных навыкаў у шырокія працоўныя масы павінны стаць прыкладам для адстаючых РК Чырвонага Крыжа, як, напрыклад, Лагойскаму РК Чырвонага Крыжа (старшыня тав. Гантман).

Аб яго бяздзейнасці гаворыць тое, што па многіх сельсоветах не існуе нават ні аднэй пярвічнай арганізацыі Чырвонага Крыжа, напрыклад, Беларуцкім, Юркаўскім, Швабскім і другіх. За ўвесь 1934 год выпушчана толькі 19 значкістаў ГСО. Пярвічнымі арганізацыямі ніхто не кіруе. Учота работы ў РК няма.

Вельмі дрэнна работае РК Чырвонага Крыжа Рэчыцы. (Старшыня Камітэта тав Пекарэўская), а также Тураўскі РК (старшыня т. Гурніцкі).

Наша задача, задача Чырвонакрыжных арганізацый, па прыкладу лепшых камітэтаў, дабіцца большых поспехаў у рабоце па аздараўленню працы і быта працоўных, па ўмацаванню абаронай магутнасці краіны.

Грэўнёва.

АНДРЭЙ УШАКОЎ

ВАРАШЫЛАЎСКІ СТРАЛОК

Як першыя замаразкі—сівізна
Кранула суровым холадам скроні.
Але ў вачох расквітае вясна,
Погляд, як сонца гарачага промні.
Юнацкім задорам свяціцца твар,
Жыве маладосць ў яе кожнай справе.
Стаіць за варштатам і шклю акуляр
Старанна і шпарка ўціскае ў аправу.
Не па гадах яшчэ цвёрда рука.
У працы напружаны кожны мускул.
Значок варашылаўскага стралка
Прыемна ўпрыгожвае чыстую блузку.
І часам угледзеўшы гэты значок,
Над ёй з брыгады пакпяць сяброўкі:
— Ішла-б ты дамоў—гадаваць дачок,
Ці бабская справа страляць з вінтоўкі?
Крыўднай усмешкай скрывіцца рот,
З дакорам зірне (і змоўкнуць дзяўчаты),
І ўспомніць адзін баявы эпізод,
Калі партызанкай была ў дваццатым.
Паслалі ў разведку. Г ядзіць—афіцэр
З-за дрэва насупар прыцэліўся з маўзера...
Яна таксама бярэ на прыцэл...
Стрэл прагучаў... Не папала, прамавала.
Кругам пайшла ў вачах зямля.
І боль у баку... У гневе і злосці
Яна паклялася добра страляць
І ворагу рана ці позна адпомсціць.
І час нарастаў, як расце расток,
Каб прарасці першаякасным плодам.
Ганка ідзе ў вайсковы гурток,
Ганка на фабрыцы лепшы стралок,
Дзейсніць прысягу дваццатага года.
І Ганка гордая У глыбіні
Сэрца тоіць вялікую радасць;
Можа сама цяпер абараніць
Сваю радзіму ад розных гадаў.
Радзіму, якая дала ёй ўсё—
Волю й жыццё маладосцю багатае.
Не дарма экзамен на ГэСэО
Здаваць рыхтуюцца ўсёй брыгадай,
Каб нашай ніхто не крануўся вясны
Сваімі драпежніцкімі рукамі;
Каб на выпадак ліхой вайны
Быць санітарамі і стралкамі.



ЦЕНТР. ГОСБИБЛИОТЕКА Т.С.С.Р.
Инв. №

„Мы стаім за мір і адстаіваем справу міра. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны"

(*СТАЛІН*).

МАГУТНАЯ—НЕПЕРАМОЖНАЯ

З грандыёзнымі поспехамі Совецкі Саюз завершыў 1934 год. Атрыманы перамогі на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва. Совецкая металургія дала 10 млн. тон чыгуна, здабыта 19 млн. тон нафты. Па цяжкой прамысловасці план за 1934 год перавыканан. Калектывізацыя ў нашай краіне ў асноўным завершана: 80 проц. сялянскіх гаспадарак да пачатку 1935 года аб'яднана ў калгасы. Соцыялістычная сельская гаспадарка дала магчымасць адмяніць картачную сістэму на хлеб.

Гэтыя грандыёзныя перамогі сталі магчымымі толькі на падставе ажыццяўлення генеральнай лініі партыі, толькі дзякуючы кіраўніцтву ленінскага ЦК нашай партыі на чале з тав. Сталіным, толькі дзякуючы таму, што пад гэтым кіраўніцтвам мы змаглі апрануць краіну ў метал, зрабіць межы нашай вялікай радзімы непрыступнымі, стварыць выдатнейшую авіяцыю, артылерыю, бронемеханічныя сілы.

Мільённыя масы рабочых і калгаснікаў нашай краіны, а разам з імі пролетарыі ўсяго свету адзначаюць XVII гадавіну Чырвонай арміі, праводзяць дзень агляду яе баяздольнасці, падводзяць вынікі, праробленыя за XVII год работы па стварэнню і ўмацаванню першай у свеце арміі рабочых і сялян.

Зроблена многа. У дакладзе на VII З'ездзе Советаў тав. Молатаў адзначыў: „мы лічым вялікім нашым дасягненнем, што за справаздачны перыяд тэхнічнае ўзбраенне Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі значна ўзрасло. Гэта бачна хаця-б з наступнага: у параўнанні з перыядам мінулага З'езда Советаў, механічнае ўзбраенне (колькасць механічных конскіх сіл) на аднаго чырвонаармейца ў нашай арміі ўзрасло ў 4 разы. Дзякуючы выключнай увазе да гэтай справы з боку тав. Сталіна, мы правялі з вялікім поспехам гэту справу".

Совецкі ўрад неўстанна змагаўся за мір і працягвае сваю мірную палітыку. Усе магчымыя сродкі былі накіраваны на тое, каб узмацніць справу міра, стварыць умовы для нармальнай творчай работы па выкананню грандыёзнай праграмы другой пяцігодкі.

Але „нам прыходзілася лічыцца з тым, што непасрэдная небяспека вайны для СССР узмацнілася. Аб вайне супроць Совецкага Саюза даўно ўжо адкрыта гавораць некаторыя ўліяцельныя кругі ў Японіі. Нельга забываць і аб тым, што ў Еўропе цяпер ёсць кіруючая партыя, адкрыта абвясціўшая гістарычнай сваей задачай захоп тэрыторыі ў Совецкім Саюзе. Не бачыць набліжэння новай вайны—значыць закрываць вочы на галоўную небяспеку".

Гэтыя словы тав. Молатава на VII З'ездзе Советаў павінна моцна запамятаць кожная працоўная жанчына нашай Совецкай краіны.

Узмацняць абарону краіны, усякімі сродкамі павышаць магутнасць нашай вялікай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі—баявая задача кожнага рабочага і работніцы, кожнага калгасніка і калгасніцы нашай краіны.

Гісторыя Чырвонай Арміі непарыўна звязана з імем тав. Сталіна. Арганізацыя Чырвонай Арміі, яе гераічныя перамогі на франтах грамадзянскай вайны, рост яе палітычнай і тэхнічнай магутнасці праходзілі і праходзяць пад непасрэдным кіраўніцтвам правадыра сусветнага пролетарыята таварыша Сталіна, які згуртоўваў і згуртоўвае яе рады вакол ленінскай партыі, які вёў і вядзе яе ад перамогі да перамогі.

Гісторыя Чырвонай арміі непарыўна звязана з імем жалезнага наркома—Кліменція Ефремавіча Варашылава, пад непасрэдным кіраўніцтвам якога яна стала магутнай сілай па ахове граніц Совецкага Саюза, верным аплотам міра.

Няхай жыве XVII гадавіна Чырвонай Арміі!

Няхай жыве Чырвоная армія—аплот мірнай палітыкі Совецкага Саюза і яе выпрабаваны жалезны палкаводзец тав. Варашылаў!

Няхай жыве наша вялікая комуністычная партыя і правадыр сусветнага пролетарыята—наш вялікі Сталін!

Прамова намесніка народнага камісара абароны тав. М. Н. ТУХАЧЭЎСКАГА

на VII Усесаюзным З'ездзе Советаў

Таварышы, у першую чаргу моц нашай рабоча-сялянскай Чырвонай арміі заключаецца ў тым, што яна дружна, як адзін чалавек, ідзе за кіраўніцтвам комуністычнай партыі, за кіраўніцтвам нашага вялікага правадыра тав. Сталіна (**апладысменты**).

Рашэнні XVII партыйнага з'езда і даклад тав. Сталіна з'яўляліся за апошні год для Чырвонай арміі, для яе партыйных арганізацый, для ўсёй беспартыйнай масы чырвонаармейцаў і начальствуючага складу тымі асноўнымі дырэктывамі, якія ажыццяўляліся і праводзіліся ёю ў жыццё.

Чырвоная армія ўкамплектавана на 45,5 проц. рабочымі. Сярод яе сялянскага складу—90 проц. калгаснікаў. Само сабой зразумела таму тая чуткасць, тая ўвага ўсёй чырвонаармейскай масы, якія яна праяўляе ў адносінах да ўсіх рашэнняў партыі, яе з'ездаў і пленумаў ЦК. Чырвонаармейцы з'яўляюцца перадавымі праваднікамі гэтых рашэнняў. Мы павінны сказаць зусім цвёрда, што палітыка-маральны стан Чырвонай арміі моцны, як ніколі (**працяжныя апладысменты**).

Гэта выражаецца не толькі ў палітычнай развітасці, у класавай самасвядомасці чырвонаармейскіх мас, але сказваецца і ў тым, між іншым, што Чырвоная армія працуе літаральна дзень і ноч над задачай умацавання абароны краіны, над задачай асваення той аграмаднай тэхнікі, якую наша краіна дала Чырвонай арміі. Гэта задача, таварышы, надзвычай цяжкая, складаная. Вайсковая справа зараз выглядае зусім па-новаму. Тактычныя нормы, тактычныя формы змяняюцца. Метады вучобы і выкладання таксама развіваюцца з года ў год. І толькі пры тым найвялікшым энтузіязме да пытання баявой падрыхтоўкі, які мы маем у Чырвонай арміі, можна своечасова вырашаць гэтыя задачы. Само сабой зразумела, што асноўным палажэннем, асноўным момантам, які рушыць нашых камандзіраў і чырвонаармейцаў на вывучэнне вайсковай справы, на стварэнне і ўмацаванне новых форм узброенай барацьбы, з'яўляецца ў першую чаргу класавая згуртаванасць, разуменне класавых задач, разуменне тых задач, якія стаяць перад нашым Совецкім Саюзам.

Мы маем значную партыйна-комсамольскую праслойку ў арміі—49,3 проц. У нашым начальніцкім складзе гэта праслойка значна вышэйшая, яна дасягае 68,3 проц. Калі-ж мы прагледзім, якія паасобныя звенні ў кадрах камандnага складу, то ўбачым, што сярод камандзіраў палкоў амаль 72 проц. членаў партыі, сярод камандзіраў дывізій—да 90 проц. і сярод камандзіраў карпусоў—100 проц. Разам з тым павышаецца пралетарская праслойка ва ўсіх звеннях камандnага складу.

Але, нашы камандзіры працуюць днём і ўночы над павышэннем не толькі сваёй ваеннай асветы, але і над павышэннем усёй агульнай культурнай падрыхтоўкі. І тут мы таксама маем значныя рэзультаты. Звыш 15 проц. нашых камандзіраў палкоў і звыш 50 проц. камандзіраў дывізій і карпусоў скончылі розныя вайсковыя акадэміі.

Такім чынам мы маем у Чырвонай арміі ўсе падставы для таго, каб армія была першакласнай, каб армія была не толькі першакласна узброенай, але і арміяй, якая па культурнаму, па сапраўднаму ўмее скарыстаць яе ўзбраенне.

Бытавое становішча нашага чырвонаармейскага і камандна-палітычнага складу таксама паляпшалася з года ў год. Вядома, нам застаецца жадаць у гэтых адносінах яшчэ вельмі многага, але за гэтыя гады бесперапынна павялічвалася і заработная плата чырвонаармейцаў, і начскладу і агульны размер іх гадавога ўтрымання. З года ў год паляпшаецца казарменны фонд Чырвонай арміі. Але, паўтараю, у гэтых адносінах мы павінны жадаць значна большага.

Калі гаворыш аб вучэбнай рабоце чырвонаармейцаў, нельга не сказаць і аб той рабоце, якая праводзіцца ў Асоавіяхіме. Тут мільёны рабоча-сялянскага насельніцтва падрыхтоўваюцца для таго, каб уступіць у рады Чырвонай арміі, падрыхтоўваюцца для таго, каб у часе вайны выступіць з абноўленымі ваеннымі ведамі.

Перападрыхтоўка — задача выключнай важнасці і яна з года ў год усё з большай і большай напружанасцю праводзіцца нашым Асоавіяхімам. Асоавіяхім і Чырвоная армія рука аб руку працуюць вельмі шмат і над пытаннямі фізічнай падрыхтоўкі. Задача гэта з'яўляецца выключна важнай. Тэхніка, нягледзячы на тое, што яна як быццам-бы замяняе сабой фізічную працу, тым не менш, як нам паказвае практыка і вопыт, патрабуе бадзёрасці і энергіі. Для таго, каб быць добрым байцом-танкістам, для таго, каб быць добрым лётчыкам, трэба быць вельмі выносліым, трэба быць фізічна загартаваным, і ў гэтых адносінах Чырвоная армія і Асоавіяхім праводзяць вялікую работу.

Задача падрыхтоўкі хімічнай абароны краіны—

задача надзвычай вялікая. Але яна выходзіць за межы кампетэнцыі Чырвонай арміі і Асоавіяхіма. Над гэтай задачай павінна працаваць уся краіна.

Небяспека будучай вайны з боку капіталістычных дзяржаў для нас з'яўляецца бясспрэчнай, і таму мы павінны ўзмоцнена працаваць з года ў год, павышаючы моц нашай супроць-хімічнай абароны.

Вы ведаеце, што за апошнія гады наша тэхніка вельмі выросла. Наша партыя і ў першую чаргу тав. Сталін, які асабіста кіраваў развіццём нашай ваеннай тэхнікі, высунулі задачу стварэння магутнай не толькі па колькасці, але і магутнай па якасці авіяцыі, задачу ўзмацнення нашай арміі шматлікімі танкавымі сродкамі, задачу узмацнення нашай арміі і ў першую чаргу, безумоўна, авіяцыі і танкавых войск магутнай сучаснай артылерыяй. У гэтым кірунку ішла вялікая работа. Няменшая работа была праробліна па стварэнню магутнага абарончага значэння, морскага флота. Такавы асноўныя паказальнікі па росту тэхнічных родаў войск.

Авіяцыя, да развіцця якой мы прыкладалі за апошнія гады найбольшыя намаганні, выросла з часу з'езда советаў на 330 проц. Гэта паказвае колькасны рост.

Але не толькі ў колькасці заключаецца магутнасць сучаснай авіяцыі. Пры нашых гіганцкіх тэрыторыях, пытанні дальнасці палёту, пытанні грузападзёмнасці, пытанні быстраходнасці самалётаў адыгрываюць першаступеннае значэнне. І вось на працягу апошніх гадоў, або лепш сказаць, асабліва на працягу апошняга года, або двух апошніх гадоў мы, безумоўна, маем у гэтай галіне рашучыя дасягненні. Наша авіяцыя і да гэтага часу стаяла на агульным ўзроўні сучасных патрабаванняў самалётнай тэхнікі, але за апошнія гады яна шагнула, паўтараю, далёка наперад. Мы зараз маем, напрыклад, павелічэнне скорасных паказальнікаў нашых знішчальнікаў і бамбардыроўшчыкаў у паўтара-два разы. Дальнасць палётаў і грузападзёмнасць бамбардыроўшчыкаў павялічылася амаль у 3 разы.

Таварышы, цяжка нават сказаць, наколькі гэтыя якасныя паказальнікі маюць вялікае значэнне. Чым большая скорасць самалёта, тым ён цяжэй уязвім з боку зенітнай артылерыі, тым ён цяжэй уязвім з боку знішчальнікаў праціўніка. Таму, гэтыя паказальнікі адыгрываюць не меншае, а часамі і большае значэнне, чым паказальнікі колькаснага парадку. Чырвоная армія, авалодваючы новай авіяцыйнай тэхнікай, працуе ўзмоцнена. Мы маем значнае зніжэнне аварыйнасці. Мы маем значнае павышэнне баявой падрыхтоўкі авіяцыйных падраздзяленняў, прычым наша авіяцыя падрыхтоўваецца тактычна як для ўзаемадзеяння з другімі родамі войск—сухапутнымі і морскімі,—так і для выконвання самастойных паветраных аперацый, якія ў будучай вайне набудуць асабліва вялікае значэнне.

Танкі выраслі вельмі значна. З часу VI з'езда советаў мы маем наступнае процантнае павелічэнне: у адносінах танкетак—2.475 проц., у адносінах лёгкіх танкаў—760 проц., у адносінах сярэдніх танкаў—792 проц. Гэта, вядома, гаворыць вам аб тым, што наша армія па свайму тэхнічнаму базісу стала цяпер зусім іншай. Калі да гэтага дадаць, што якасныя паказальнікі значна выраслі, што скорасць, напрыклад, нашых танкаў узрасла ад 3 да 6 раз, то гэтыя лічбы для вас стануць яшчэ больш значнымі.

Значныя поспехі мы маем у справе артылерыйскага ўзбраення. З часу VI з'езда советаў колькасць кулямётаў для стралковых і кавалерыйскіх злучэнняў павялічылася ў два з лішкам разы, колькасць кулямётаў для авіяцыі і танкаў—у 7 раз, колькасць гармат танкавых і супроцьтанкавых выросла ў 4 з паловай разы, колькасць цяжкай атрылерыі выросла ў 2 з лішкам разы.

Але не толькі гэтымі колькаснымі паказальнікамі вымяраецца тэхнічная магутнасць нашай артылерыі. Шпарка расце яе якасць. Мы маем цэлы рад новых, дасканалых, зусім сучасных гармат, якія ўкараняюцца ў Чырвоную армію. Апрача гармат мы цяпер маем значна больш дасканалыя знарады, узрывацелі, трубкі і т. д. Гэта мае аграмаднае значэнне.

Буйны рост мы маем ў галіне радыёфікацыі нашай арміі. Тэхнічнае аснашчэнне войск патрабавала найбольш сучасных сродкаў сувязі. Вырастае рухомасць вайсковых злучэнняў. Без росту гэтай рухомасці нельга скарыстаць усіх пераваг авіяцыі, нельга скарыстаць усіх пераваг танкаў, нельга скарыстаць усіх пераваг скорастрэльнасці і дальнабойнасці сучаснай артылерыі, а рост рухомасці патрабуе надзвычай вялікага майстэрства ва ўпраўленні войскамі, якое без дасканалых сродкаў сувязі немагчыма. Таму пытанню радыёфікацыі Чырвонай арміі аддавалася значная ўвага.

З часу VI з'езда агульны лік радыёстанцый вырас на 1.750 проц., лік авіяцыйных радыёстанцый вырас на 1.900 проц.

Такім чынам у галіне авіяцыі, у галіне танкаў, у галіне ўсяго нашага сухапутнага ўзброенага будаўніцтва мы маем значныя поспехі. Тут наша партыя нямала папрацавала, тут нямала папрацаваў Серго Орджанікідзе і тав. Варашылаў, які з года ў год дабіваўся усё большай і большай тэхнікі, і асабліва шмат тут зрабіў тав. Сталін, які асабіста і штодзённа кіраваў гэтай справай. **(З'езд наладжвае т. Сталіну бурную авацыю).**

Морскі флот таксама значна вырас з часу VI з'езда. Калі ўзяць за 100 проц. што мы мелі к часу VI з'езда, то мы зараз маем 535 проц. падводных лодак, 1.100 проц. вартавых караблёў, 470 проц. тарпедных катэраў і т. д. Словам, і ў гэтым кірунку, у кірунку ўмацавання нашых морскіх берагоў мы зрабілі значныя поспехі за прайшоўшы перыяд.

Тав. Молатаў у сваім дакладзе указаў, што «нам прышлося павялічыць і колькаснасць Чырвонай арміі».

У якіх галінах будаўніцтва РСЧА адбыліся змены, якія пацягнулі за сабой павелічэнне колькаснасці?

Па-першае, як указаў тав. Молатаў, «мы пабудавалі за апошнія гады нямала ўмацаваных раёнаў з неабходным узбраеннем на нашых заходніх і ўсходніх граніцах». Яшчэ на XVII партыйным з'ездзе тав. Варашылаў далажыў, што мы прыкрылі ўмацаванымі раёнамі «нашу заходнюю граніцу ад Ладажскага возера і да Чорнага мора», а таксама «найбольш пагражальныя напрамкі на нашым Далёкім Усходзе і ва Усходняй Сібіры».

Большая частка гэтых умацаваных раёнаў была закончана пабудовай і ўзбраеннем у 1934 годзе. Вядомыя вам жаданні імперыялістаў, якія стараюцца асабліва на Усходзе падрыхтавацца да нечаканага захвату нашай тэрыторыі, у прыват-

насці Прымор'я, прымусілі нас вельмі сур'ёзна аднесціся да пытання аб стварэнні гарнізонаў, якія абараняюць умацаваныя раёны. Што могуць азначаць жалезабетонныя пабудаванні і магутная зброя, заключаная ў іх, калі ў гэтых умацаваннях не будзе людзей, якія ўладаюць гэтай зброяй і абараняюць ўмацаванні! Умацаванні знаходзяцца блізка ад граніцы. Каб іх не маглі беспакарана захапіць нашы ворагі, мы вымушаны былі сфармаваць шматлікія гарнізоны, размясціць іх ва ўмацаваных раёнах, забяспечыць іх казармамі і элементарнымі ўмовамі культурнага быту. Трэба заўважыць, што вельмі часта прыходзілася будаваць умацаваныя раёны ў бязлюдных, пустынных мясцах. Само сабой зразумела, што стварэнне спецыяльных гарнізонаў на грамадным працяжэнні нашых граніц патрабавала, па-першае, саліднага павелічэння колькаснасці арміі, а, па-другое, вялікіх грашовых затрат. На жаль, абстаноўка не дазволіла нам адцягваць тэрмінаў прывядзення ў поўную гатоўнасць нашых сродкаў абароны.

Па-другое, значных людскіх і фінансавых рэсурсаў патрабавала ад нас сканчэнне ў 1934 г. цэлага раду пунктаў берагавой абароны ў Балтыцкім і Чорным марах, «у раёне Мурманска і, асабліва на Далёкім Ўсходзе», аб чым тав. Варашылаў таксама дакладваў XVII партыйнаму з'езду .

Па-трэцяе—«наш морскі флот расце, але за кошт суднаў такога тыпу і, перш за ўсё, за кошт падводных лодак, абарончае значэнне якіх зразумела», як аб гэтым сказаў тав. Молатаў. Найбольшая колькасць падводных лодак перайшла сваім сканчэннем на 1934 год, а гэта пацягнула за сабой фармаванне не толькі экіпажаў, але і розных баз падводных лодак, а гэта зноў такі патрабавала людскіх і фінансавых сродкаў.

Нарэшце, развіццё авіяцыі, танкаў і артылерыі, а мы, як указаў тав. Молатаў, «асабліва ўпарта працавалі ў гэтым кірунку», таксама не магло не патрабаваць павелічэння колькаснасці арміі.

Ці маглі мы задаволіцца старой дыслакацыяй навейшых тэхнічных сродкаў барацьбы, той дыслакацыяй, якая існавала да ўскладнення становішча на Далёкім Ўсходзе? Безумоўна не. Мы не можам, дзякуючы гіганцкім прасторам нашай тэрыторыі, манеўраваць так, як, напрыклад, манеўравала Германія ў 1914—18 гг. паміж сваімі заходнім і ўсходнім франтамі.

У 1914 годзе германскае камандванне за 6—7 дзён перакінула з французскага фронта ва Ўсходнюю Прусію 6 пяхотных дывізій. У далейшым германскае камандванне на працягу 10—15 дзён перакідала з аднаго фронта на другі цэлыя арміі. Зусім іншая справа ў нас. Калі, напрыклад, для сканцэнтравання па чыгункі ад Берліна да Льежа адной пяхотнай дывізіі немцам прышлося-б затраціць якіх-небудзь 15 млн. тона-кіламетраў, то нам для перакідкі такой-жа дывізіі з Масквы ва Владзівасток патрабуецца 200 млн. тона-кіламетраў. Такім чынам разлічваць на хуткія перакідкі значных вайсковых мас па так званых унутраных аперацыйных лініях нам трэба вельмі асцярожна. Неабходна моцнае самастойнае забеспячэнне як заходніх, так і ўсходніх граніц.

Нават авіяцыя, гэты найбольш рухомы і які самастойна перасоўваецца, род войск не можа дазволіць нам роскашы перакідкі яе з усхода на захад, па меры наспявання патрэбы ў ёй то на тым, то на другім фронце. Я прывяду найбольш характэрны прыклад перакідкі авіяцыі на далёкія адлегласці, прыклад, меўшы месца ў 1934 годзе. Я гавару аб славутым пералёце Лондан—Мельбурн, у якім прынялі ўдзел 20 найбольш дасканалых самалётаў. З гэтага ліку даляцела да Мельбурна толькі 6, прычым за час пералёту мелі месца дзве аварыі і адна катастрофа.

Такім чынам, абставіны прымусілі нас стварыць на Далёкім Ўсходзе цэлую сістэму самастойных часцей авіяцыі, танкаў, артылерыі і інш. злучэнняў. Падрыхтоўка кадраў новых злучэнняў—цяжкая крапатлівая справа. Мы шмат папрацавалі над ёю, нарэшце, у 1934 годзе здолелі ўвесці ў строй цэлы рад новых злучэнняў.

Аграмадныя затрудненні мы сустрэлі з размяшчэннем гэтых часцей на Далёкім Ўсходзе. У мінулым годзе прышлося пабудаваць цэлы рад новых казарменых гарадкоў і арганізаваць вялікую і вельмі складаную гаспадарку.

Само сабой зразумела, што колькаснасць Чырвонай арміі некалькі менш 600 тыс. чалавек, з якой мы не выходзілі на працягу мінулых гадоў, не магла далей адказваць новым умовам абароны граніц. У сувязі з гэтымі акалічнасцямі ўрадам была ўстаноўлена новая колькаснасць у 940 тыс. чалавек, якой Чырвоная арміі дасягнула к канцу 1934 года.

Толькі развіццё тэхнікі, механізацыя цэлага раду працэсаў дазволілі абмежавацца гэтай лічбай. Царская армія, напрыклад, налічвала ў сваіх радах да вайны 1914 г. 1.458.762 чал.

Няма ніякага сумнення ў тым, што калі-б не геніяльная празорлівасць тав. Сталіна і не своечасова прынятыя ім меры ўзмацнення нашых далёка-ўсходніх граніц, то мы не карысталіся-б з вамі прадаўжаючымся мірам і не маглі-б ажыццявіць тых вялікіх заваяванняў соцыялізма, якімі ганарымся мы і ганарацца пролетарыі ўсяго свету **(бурныя апладысменты).**

Рост колькаснасці Чырвонай арміі, увод у строй новых падводных лодак і іншых караблёў, сканчэнне ўмацаваных раёнаў і інш. выклікалі значнае перавышэнне ваенных расходаў, намечаных па дзяржаўнаму бюджэту на 1934 год. Асабліва сказаўся на перавышэнні цэлы рад эканамічных прычын, павысіўшых кошт ваеннай прадукцыі і інш. Я не буду на гэтых прычынах спыняцца, бо аналіз гэтых акалічнасцей будзе зроблен т. Грынько. Замест намечаных на 1934 год 1 млрд. 665 млн. руб., расходы Наркамата абароны дасягнулі 5 млрд руб. **(апладысменты).** На 1935 год асігнаванні па Наркамату абароны дасягаюць 6,5 млрд. руб. **(апладысменты).** Не гледзячы на тое, што лічбы гэтыя вялікія, мы усё-ж трацім на падрыхтоўку абароны значна меншую частку агульнадзяржаўнага бюджэта, чым любая буйная капіталістычная краіна. Нашы ваенныя расходы складаюць толькі 10 проц. ад дзяржаўнага бюджэта, у той час, як у Японіі яны дасягаюць 46,5 проц., у Польшчы—40 проц. і т. д.

Таварышы, усе гэтыя мерапрыемствы, забяспечыўшыя значны рост тэхнічнай магутнасці Чырвонай арміі, ва ўвесь рост, ва ўпор паставілі перад работнікамі Чырвонай арміі задачу асваення гэтай тэхнікі, задачу падрыхтоўкі людзей, уладаючых гэтай тэхнікай, і над гэтымі задачамі мы працуем, паўтараю, яшчэ раз, дзень і ноч.

За апошнія гады мы мелі значныя поспехі ў баявой падрыхтоўцы. Рашуча выросла стралковая падрыхтоўка нашых войск. Мы маем цяпер вялікі лік снайпераў, г. зн. выключна меткіх стралкоў. Мы дабіліся значнай дысцыпліны ў маршах. У манеўраванні мы дасягнулі вялікай мабільнасці, рухавасці, быстрыні ў правядзенні маршаў. Яшчэ некалькі гадоў таму назад мы не ўяўлялі нават сабе, што маршы можна рабіць з такой быстрынёй, як гэта робяць войскі зараз.

Мы працуем над пытаннямі разведкі, якія маюць аграмаднае значэнне, асабліва ва ўмовах быстрага развіцця сучасных аперацый і баёў. Мы працуем над развіццём рухавасці, смеласці, над пытаннямі развіцця ініцыятывы, самадзейнасці, напорыстасці, нахрапу сказаў-бы я груба. Гэта—пытанне, ад якога зараз залежыць усё.

Ва ўвесь рост паўстае пытанне кіравання. Мала мець рухавую тэхніку, мала мець людзей, якія індывідуальна умеюць гэтай тэхнікай уладаць, трэба яшчэ мець людзей і апараты, гатовыя да кіравання баямі і аперацыямі, якія развіваюцца ў сувязі з укараненнем новай тэхнікі значна хутчэй чым раней—маланкавымі тэмпамі. Гэта задача не простая. Мы прывыклі за час грамадзянскай вайны да конніцы, як да самага быстрага роду войск, а большасць прывыкла да пяхотных дзеянняў і перабудавацца на новы лад, умець скарыстаць рухомасць авіяцыі і нашых механізаваных войск, нашых танкаў не так-то проста.

Гэта задача вельмі вялікая і над пытаннямі кіравання боем, над пытаннямі арганізацыі цеснага, бесперапыннага ўзаемадзеяння, бо кожны род войск у паасобку не дасць поўнага эфекту,—мы працуем асабліва моцна.

Асноўны стрыжань нашай баявой падрыхтоўкі на 1935 год накіраван на тое, каб аўладаць тэхнікай і майстэрствам кіравання быстрацечнымі формамі агульна-вайсковага бою. Мы і на сённешні дзень нічога агульнага не маем з царскай арміяй—непаваротлівай, мешкаватай, нязграбнай. Наша армія далёка адышла ад гэтай недасканаласці. Але і гэтыя дасягненні для нас яшчэ зусім недастатковы, і мы перад сабой паставілі на 1935 год задачу дасягнення такіх поспехаў, каб тая тэхніка, якая ёсць у нашых руках, была скарыстана на 100 проц. і дала ўсю тую магутнасць, якую яна можа даць. У гэтым—асноўная зарука нашай перамогі.

Наша рабоча-сялянская Чырвоная армія—моцная. Яе палітычная магутнасць, яе рэволюцыйная магутнасць—непераможны, і гэта патрабуе, каб мы ўмелі так весці бой, так скарыстаць нашу тэхніку, каб і ў гэтай галіне не было ў свеце арміі роўнай нашай Чырвонай арміі. **(Працяжныя бурныя апладысменты).**

Вайна рыхтуецца, таварышы, супроць нас узмоцненымі тэмпамі. Мы ў Чырвонай арміі гэта разумеем. Мы поўны пільнасці і рыхтуемся адбіць гэтыя ўдары.

Няхай-жа нашы ворагі папрабуюць моц нашых граніц! Як адзін чалавек уся наша калгасная і рабочая краіна стане на абарону сваёй зямлі, а магутная Чырвоная армія, магутная сваім рэволюцыйным энтузіязмам, пад жалезным кіраўніцтвам Кліма Варашылава!.. **(Бурныя апладысменты, пераходзячыя ў авацыю. Воклічы: «Ура!». «Няхай жыве Чырвоная армія пад кіраўніцтвам таварыша Варашылава!» «Ура!», Няхай жыве Варашылаў!» «Ура!».)** пад сцягам комуністычнай партыі, на чале з нашым вялікім Сталіным **(Бурныя апладысменты, воклічы «Ура!». Спяванне «Інтэрнацыянала»)** Чырвоная армія разгроміць інтэрвентаў і забяспечыць перамогу над ворагамі Окцябрскай рэволюцыі. **(Усе устаюць). Воклічы з залы: «Няхай жыве сусветная рэволюцыя», «Няхай жыве кіраўнік соцыялістычных перамог, наш правадыр таварыш Сталін!» Зала наладжвае бурную авацыю. Воклічы: «Няхай жыве таварыш Варашылаў!», Чырвонай арміі—«ура!». «Няхай жыве вялікі Сталін!» «Ура!», Доўга незамаўкаючыя апладысменты).**

Голас з месца: «Няхай жыве таварыш Сталін!» Крыкі «ура!». Уся зала, стоячы, бурна, працяжна апладыруе.

Гора тым, хто выступіць супроць краіны Советаў — рэволюцыйная Чырвоная Армія ўшчэнт разграміць усіх тых, хто пасягне на нашу мірную працу, на незалежнасць нашай соцыялістычнай радзімы.

Новая эпоха совецкай дэмакратыі

VII Усесаюзны З'езд Советаў, які закончыўся, знамяную сабой цэлую эпоху развіцця Окцябрскай соцыялістычнай рэволюцыі. Ад з'езда к з'езду мацнела і развівалася наша краіна. Расла магутнасць сусветнага рабочага класа. Пачынаючы з 2-га Усерасійскага з'езда советаў, які адкрыўся ў грозныя дні Окцябра, земны шар верціцца пад новай зоркай. Колькі ні змагаліся з пролетарскай рэволюцыяй імперыялістычныя інтэрвенты, колькі ні брахалі на яе псы буржуазіі, колькі не шалелі ворагі рэволюцыі—нішто не дапамагло. Ім не ўдалося павярнуць назад гісторыю. Наступіла новая эра, якая можа закончыцца толькі адным—поўным таржаством соцыялізма, канчатковай гібеллю капіталізма ва ўсім свеце.

З першых-жа дзён існавання маладая Совецкая краіна явіла свету цуды гераізму і доблесці. Яна перамагла на ўсіх франтах ва многа раз лепш узброенага праціўніка. Пролетарская ўлада трымала ў ёжавых рукавіцах сваіх ворагаў унутры краіны. І атрымаўшы „у спадчыну" жабрацкую, адсталую збяднелую краіну, падняла яе на нябачную вышыню росквіту, магутнасці і багацця.

З індустрыяльных вышынь, якія займае наша краіна сёння, мізэрным і нікчэмным выглядзіць гаспадарчы ўзровень дарэволюцыйнай Расіі. Незлічоны нашы дасягненні, нашы багацці, нашы магчымасці. І ўсё гэта зроблена, здабыта нашымі рукамі, нашымі сіламі, нашым вызваленым ад іга капіталізма гераічным народам. Вось чаму з такой упэўненасцю гучэлі даклады і прамовы з трыбуны VII З'езда Советаў, вось чаму з такой лікуючай і бязмежнай радасцю вітаў з'езд натхніцеля ўсіх нашых дасягненняў—тав. Сталіна.

Змены, якія адбыліся за XVII год рэволюцыі, настолькі вялікі, што VII з'езд советаў СССР прадстаўляе ўжо не тую краіну, што II усерасійскі з'езд советаў. Краіна наша стала не толькі ва многа раз мацней і багацей. Яна стала на справе соцыялістычнай краінай, 93 проц. усіх вытворчых фондаў у краіне належаць цяпер соцыялістычнаму сектару і толькі 4 проц. прыватнаму. Соцыялістычная ўласнасць стала асновай нашага ладу.

Калі прымалася ў 1918 годзе Совецкая Канстытуцыя, краіна была толькі па назве, па характару ўлады, якая ў ёй устанавілася, соцыялістычнай. Гэта назва вызначалася нашай праграмай, мэтаю нашай барацьбы. Цяпер праграма стала рэальнасцю, праграма праведзена ў жыццё. Вось чаму пленум ЦК ВКП(б) па ініцыятыве тав. Сталіна вынес пастанову аб неабходнасці некаторых змен у Канстытуцыі. VII з'езд советаў аднадушна прыняў прапанову Цэнтральнага Камітэта большэвіцкай партыі. Совецкая Канстытуцыя будзе прыведзена ў адпаведнасць з тымі зменамі, якія адбыліся ў соцыяльнай і гаспадарчай структуры краіны.

Старшыня Совета Народных Камісараў тав. Молатаў у двух бліскучых дакладах разгарнуў вычарпальную карціну таго новага, што адбылося ў нашай краіне.

Працоўная сям'я Совецкай краіны адзіна зараз як ніколі. Усё больш шырокія, у поўным сэнсе мільённыя масы, прымаюць актыўны ўдзел у соцыялістычным будаўніцтве, у дзяржаўным кіраванні. І дыктатура пролетарыята разгортвае сцягі совецкага дэмакратызма да канца.

Совецкі лад з пачатку свайго ўзнікнення быў самым дэмакратычным ладам у свеце. Ён быў створан працоўнымі масамі ў імя інтарэсаў працоўных мас. Яго астрыё накіравана супроць ворагаў народу. Яго вышэйшым законам з'яўляецца дабро працоўнага народу. Тыя змены, якія волею VII з'езда советаў будуць цяпер унесены ў нашу Канстытуцыю, расшыраюць совецкі дэмакратызм, даюць магчымасць найбольшаму ліку людзей прыняць удзел у кіраванні дзяржавай.

Большэвіцкая партыя ніколі не лічыла самамэтаю тыя абмежаванні, якія ўстанаўлівала для некаторых слаёў насельніцтва Совецкая Канстытуцыя. Як інструмент барацьбы за соцыялізм, Совецкая Канстытуцыя заклікана была забяспечыць пролетарскае кіраўніцтва ў сялянскай краіне. Нашы поспехі ў будаўніцтве соцыялізма настолькі вялікі, што мы можам цяпер ўжо адмяніць некаторыя ўстарэўшыя абмежаванні. Саюз рабочага класа і сялянства ўсямерна мацаваць, які завяшчаў нам Ленін, дасягнуў бліскучых поспехаў. Рабочы клас дапамог сялянству пакончыць з галечаю і варварствам і стаць на шлях будаўніцтва радаснага соцыялістычнага жыцця.

Рашэннем ЦВК СССР з 1931 года быў устаноўлен парадак аднаўлення ў грамадзянскіх правах тых выселеных кулакоў, якія на справе спынілі барацьбу супроць калгасаў і совецкай улады і заняліся чэснаю працай. Колькасць людзей, пазбаўленых выбарчых праў, у нас ужо зараз зусім малая,—2,5 проц. ад агульнага ліку выбаршчыкаў. Кола лішэнцаў усё больш скарачаецца і мы ідзем да ўсеагульнага выбарчага права.

Увядзенне прамых і закрытых выбараў, як правільна ўказаў тав. Молатаў, яшчэ больш умацуе сувязь совецкіх органаў улады з масамі і дапаможа ускрыць слабыя ўчасткі ў нашай рабоце.

Наша краіна смела падымае сцяг сапраўднага дэмакратызма і совецкага парламентарызма ў той самы момант, калі буржуазія адкідае ўсё знешнія ілжыва-дэмакратычныя формы. Гэта невыпадкова. Гэта з'яўляецца толькі адбіткам таго бясспрэчнага факта, што капіталізм ідзе да

Асоавіяхім БССР да дню Чырвонай арміі

23-га лютага мы святкуем 17 гадавіну нашай слаўнай Чырвонай арміі.

Разгарнуўшы падрыхтоўчую работу да гэтай гадавіны, Асовіяхімаўская арганізацыя БССР узмоцнена праводзіць зараз рэалізацыю 9-й усесаюзнай латарэі. Сродкі ад латарэі павінны пайсці на ўмацаванне і палепшанне работы па падрыхтоўцы кадраў для Чырвонай арміі і масавастралковага спорта. У гэтай важнейшай нашай рабоце мы маем вялікія поспехі ў Лагойскім, Бярэзінскім, Аршанскім, Стара-Дарожскім, Бабруйскім, Глускім і Асвейскім раёнах. У гэтых раёнах райсоветы Асоавіяхіма пры дапамозе мясцовых арганізацый здолелі арганізаваць асоавіяхімаўскі актыў, правільна расставіць людзей, датэрмінова закончыць рэалізацыю латарэі, праводзячы адначасова ўмацаванне пярвічных арганізацый Асоавіяхіма. Па другіх раёнах гэтая работа таксама разгорнута. Але побач з гэтым трэба адзначыць, што ў такіх раёнах, як Чашнікі, Уваравічы, Мсціслаўль, Лельчыцы, Жыткавічы, Дуброўна, Горкі і Узда да рэалізацыі латарэі зусім не прыступілі.

Да дню 17-й гадавіны Чырвонай арміі мы павінны мець баявыя першапачатковыя арганізацыі Асоавіяхіма на ўсіх заводах, фабрыках, соўгасах, МТС і калгасах з добрапастаўленай работай масавага стралковага спорта па падрыхтоўцы варашылаўскіх стралкоў, уцягваючы ў гэты спорт жанчыну—работніцу і калгасніцу. З 30.000 варашылаўскіх стралкоў мы маем толькі тры проц. жанчын і выключна на заводах. Жанчыны ў соўгасах і калгасах, а таксама і жонкі компалітсклада Чырвонай арміі пакуль не ўцягнуты ў спартыўную работу па стральбе. Гэта наш велізарнейшы недахоп, на што мы павінны звярнуць асаблівую ўвагу.

Калі мы на першае студзеня гэтага года мелі толькі 570 ваенізаваных канюшань у калгасах, з ахопам 17760 коняй, то да дню Чырвонай арміі неабходна падвоіць і патроіць разгортванне работы па ўнядрэнню ваенных навыкаў у працоўныя вытворчыя працэсы калгасных мас, з тым, каб рашуча дамагчыся лепшага догляду, захавання каня і вырошчвання конскага маладняка, рашуча змагаючыся за выкананне патрабаванняў нашай партыі і совецкага ўраду.

Мы павінны ў гэтым годзе па прыкладу калгаснікаў-ударнікаў, Аршанскага раёна ахапіць усе раёны БССР стварэннем ваенізаваных канюшань у калгасах, паставіць гэтую справу на вышэйшую ступень, бязлітасна знішчаючы кулацкія класава-варожыя, нядбайныя, шкодніцкія адносіны да каня.

Зараз мы маем 1.067 караульных каманд, з колькасцю 12 422 калгаснікаў-асовіяхімаўцаў па ахове калгаснай маёмасці і 113 хімічных атрадаў па барацьбе з кляшчом і шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы. Гэтая работа праведзена толькі па 23 раёнах. Нас ні ў якай ступені не могуць задаволіць такія дасягненні. Нам трэба, каб зараз, рыхтуючыся да веснавой сяўбы, асоавіяхімаўскія арганізацыі ў раёнах узяліся за арганізацыю караульных каманд, за стварэнне хімічных атрадаў—па барацьбе са шкоднікамі ў сельскай гаспадарцы, па знішчэнню кляшча, па пратручванню насення, цесна ўвязваючы работу з агранамічнымі мерапрыемствамі Наркамзема і МТС, дапамагаючы мясцовым партыйным арганізацыям у падрыхтоўцы і правядзенні веснавой пасеўнай кампаніі.

Барацьба за павышэнне якасці баявой вучобы дапрызыўнікаў нараджэння 1913 года і ўневайскавікоў на вучэбных пунктах,—павінна стаць самай упорнейшай работай з тым, каб вучэбны пункт сапраўды ператварыўся ў цэнтр марксісцка-ленінскай вучобы, у цэнтр ваеннай падрыхтоўкі ў раёнах пад кіраўніцтвам РК партыі. У гэтых адносінах вучэбныя пункты ў Менску, Бабруйску, Касцюковічах, Бярэзіне і Лагойску сапраўды сталі лепшымі цэнтрамі ваенна-палітычнай работы.

Надзвычай дрэнна пастаўлена работа па падрыхтоўцы дапрызыўнікаў у Чашніцкім, Уваравіцкім, Мсціслаўскім і іншых раёнах, дзе мы маем правал па рэалізацыі 9 латарэі. Мы павінны раз на заўсёды пакласці канец тэй недаацэнцы Асоавіяхіма, якая маецца ў асобных месцах і да дню Чырвонай арміі ўсе вучэбныя пункты зрабіць цэнтрамі ваенна-палітычнай работы, з ахопам усіх комсамольцаў і дапрызыўнікаў.

Маючы па БССР пяць аэраклубаў (Віцебск, Гомель, Орша, Менск, Бабруйск), мы павінны вакол іх арганізаваць сотні, тысячы планерных гурткоў па фабрыках, заводах, калгасах, соўгасах і МТС па падрыхтоўцы планерыстаў і парашуцістаў з комсамола і моладзі.

Кожная школа, у тым ліку і пачатковая павінны мець гурток авіямадэлістаў з шырокім ахопам піянераў і ўвогуле дзяцей школьнага ўзросту і комсамола.

Гэта адзін з надзвычайных і цікавейшых участкаў асоавіяхімаўскай работы даў нам велізарныя вынікі па ахопу ваеннай работай дзетвары, якая гарыць небывалым высокім энтузіязмам аўладаць лётнай справай і быць меткім стралком, быць снайперам для абароны сваёй соцыялістычнай радзімы.

Энтузіязм і любоў да сваёй соцыялістычнай радзімы, любоў да свайго правадыра партыі ўсяго рабочага класа—тав. Сталіна настолькі вялікі сярод усіх працоўных, што мы маем сотні разнастайных прапаноў ад рабочых і калгаснікаў усіх раёнаў БССР па збору сродкаў на эскадрыллі і самалёты. Вось нядаўна рабселькоры, рыхтуючыся да ўсебеларускага з'езда рабселькораў, сабралі 80 000 рублёў і купілі звено—тры самалёты імя тав. Кірава, якое прывезена ўжо ў Менск і будзе ўручана ў часе з'езда Менскаму аэраклубу.

Такім, арганізацыя Асоавіяхіма БССР, якая налічвае 350 000 членаў, таварыства сустракае 17 гадавіну Чырвонай арміі з вялікімі дасягненнямі і поспехамі ў абаронай рабоце. Гэтыя дасягненні і поспехі абавязваюць нас яшчэ больш замацаваць і ўзмацніць Асоавіяхім, які пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б і СНК БССР павінен стаць баявой, лепшай арганізацыяй Асоавіяхіма пагранічнай рэспублікі.

А. ДУБІНА

НОВАЯ ЭПОХА СОВЕЦКАЙ ДЭМАКРАТЫІ

(ПРАЦЯГ)

сваёй немінучай гібелі, а соцыялізм расце і развіваецца. Тыя змены ў Канстытуцыі, якія прыняў З'езд Советаў, яшчэ больш павялічаць магутнасць Совецкага Саюза, прыцягнуць да яго сімпатыі ўсіх мыслячых і перадавых людзей земнага шара.

Большэвікам няма чаго хаваць сваіх мэтаў і планаў. Нашай мэтаю з'яўляецца мірная праца на карысць народу, і мы падрыхтавалі дастаткова сродкаў, каб гэту працу ахоўваць.

Увесь з'езд горача апладыраваў паведамленням таварышоў **Молатава** і **Тухачэўскага** аб росце, ўзброенасці і сіле нашай слаўнай Чырвонай Арміі. Мы гатовы сустрэць ворага. І да таго часу, пакуль існуюць і ўзбройваюцца падпальшчыкі вайны, мы будзем прадаўжаць узмацняць гэту гатоўнасць.

З'езд, заслухаўшы даклад тав. **Орджанікідзе**, адобрыў работу Народнага камісарыята цяжкай прамысловасці. З'езд прыняў разгорнутае рашэнне па развіццю жывёлагадоўлі. Ад нашай энергіі, ад нашай работы залежаць тэмпы росквіту жывёлагадоўлі.

VII З'езд Советаў падагуліў цэлую эпоху нашага развіцця. Ён з'яўляецца зыходным пунктам новых, яшчэ больш велічных перамог, якія мы пад кіраўніцтвам тав. Сталіна атрымаем.

(З перадавога артыкула „Правды").

Большэвіцкае прывітанне ўдарнікам друку—баявой арміі бараць

Адточым астрыё свайго пяра для канч

Лепшыя рабселькоркі нашага журнала. Справа налева: тт. **Лагунова**—завод „Большэвік", **Хадаровіч**—калгас імя Ланцуцкага, М калгас „Колас", **Ганчаронак**—завод імя Кірава, **Мірэр**—Магілеўская шоўкавая фабрыка, **Шчэрба**

Зверху ўніз тт.: **Юркевіч**—Клічэўскі РВК, **Кочарава**—завод імя Варашылава, **Барыбіна**—фабрыка „Окцябр", **Падольская**—фабрыка „Окцябр", **Вярбіцкая**—фабрыка „Окцябр", **Марголіна**—завод імя Кірава.

РАБСЕЛЬКОРЫ—ЗМАГАРЫ ЗА СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ ГРАМАДСТВА

25-га лютага адчыніцца 3-ці ўсебеларускі з'езд рабселькораў. Звыш 400 дэлегатаў—лепшых ударнікаў фабрык, заводаў, калгасаў, соўгасаў прыедуць на гэты з'езд, каб падзяліцца вопытам сваёй работы і вырашыць далейшыя практычныя задачы рабселькораўскага руху БССР.

З часу другога ўсебеларускага з'езда рабселькораў прайшло чатыры гады. За гэты час значна ўмацавалася і выросла рабселькораўская армія. Вырас наш большэвіцкі друк і палепшылася якасць яго работы. Гадавы разавы тыраж газет і журналаў складае каля мільёна экзэмпляраў. Звыш 40.000 рабселькораў аб'яднаны навокал газет і журналаў.

Пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б на чале з тав. Гікало друк БССР дасягнуў вялікіх перамог ва ўсёй сваёй рабоце. Мы лепш сталі распазнаваць класавага ворага і яго агентуру, лепш і непрымірымей змагаемся з ім. Друк узмацніў сваю работу на ўсіх франтах соцыялістычнага будаўніцтва.

З агульнага ліку рабселькораў 265 лепшых ударніц фабрык, заводаў, соўгасаў і калгасаў з'яўляюцца актыўнымі рабкоркамі і селькоркамі свайго журнала „Работніца і калгасніца Беларусі". Гэта яны—у радах лепшых барацьбітоў за выкананне прамфінплана на сваіх фабрыках і заводах, за лепшае і своечасовае правядзенне ўсіх сельскагаспадарчых кампаній у соўгасах і калгасах, за развіццё соцыялістычнай жывёлагадоўлі. Рабселькоркі—лепшыя памочнікі ў арганізацыі і выпуску насценных газет, лепшыя барацьбіты за культуру ў быту і рабоце. 180 селькорак—лепшых ударніц соцыялістычных палёў дапамагаюць наладжванню радаснага культурнага жыцця ў калгаснай вёсцы, змагаюцца за ажыццяўленне лозунга вялікага правадыра тав. Сталіна: „Зрабіць усе калгасы большэвіцкімі, а калгаснікаў—заможнымі".

Лепшыя рабселькоркі абраны дэлегаткамі на 3-ці ўсебеларускі з'езд рабселькораў. Вопыт іх работы павінен стаць здабыткам шырокіх мас работніц і калгасніц. На з'ездзе яны намецяць канкрэтныя шляхі сваёй далейшай работы за ажыццяўленне задач, пастаўленых другой пяцігодкай.

З'езд рабселькораў склікан у адказнейшы момант завяршэння падрыхтоўкі да веснавой сяўбы. Гэтай рабоце селькоркі павінны ўдзяліць усю сваю ўвагу. Арганізацыя рэйдаў-праверкі гатоўнасці да сяўбы, дапамога ў наладжванні бесперабойнага выхада агульных і брыгадных насценных газет, барацьба за развіццё соцыялістычнай жывёлагадоўлі, за поўнае захаванне маладняка, арганізацыя культурнага адпачынку калгаснікаў—вось асноўныя задачы, якія зараз павінны стаць у цэнтры ўвагі нашых селькорак.

Работніцы і калгасніцы—удзельніцы 3-га ўсебеларускага з'езда рабселькораў павінны стаць першымі змагарамі за выкананне чарговых гаспадарча-палітычных задач, якія зараз стаяць перад намі, як у прамысловасці, так і ў сельскай гаспадарцы.

...ітоў за ажыццяўленне вялікіх планаў соцыялістычных работ. ...тковага паражэння класавага ворага

...еўскага раёна, **Чайкіна**—Гомсельмаш, **Баравая**—старшыня Дуброўскага сельсовета, Касцюковіцкага раёна, **Кулікоўская**—...а—калгас імя Кагановіча, **Бардзюкова**—Сенненскі раён, **Померанц**—фабрыка „Окцябр".

У БАРАЦЬБЕ ЗА ЯКАСЦЬ Работы поезда

Штодзёнка першай жаночай ста...нскай брыгады паказальнага по...да № 89—90, Менскага вузла ...олас работніцы" дае прыклад ...аёй работы для другіх брыгад.

Штодзёнкай ахоплена шырокае ...ла рабкораў. Газета здолела па...авіць сваю работу так, што ў яе ...шуць не толькі работнікі поезда, ...е і пасажыры.

Прачытаўшы штодзёнку, перад ...чыма вырысоўваецца ўся брыга..., відаць усе бакі яе працы. Ра...й, напрыклад, для абагравання ...гонаў, вада дастаўлялася самім ...слугоўваючым персаналам, што ...ыло не па сілах работніцам. Газета ...вастрыла на гэтым увагу адмі...страцыі. У выніку—вада ў топкі ...стаўляецца вадалізамі.

...азета своечасова сігналізуе аб ...равядзенні тых ці іншых кампа...й. Парторгам і рэдактарам што...ёнкі тав. Дудо праводзіцца рэгу...рная чытка газет і прапрацоўка ...іх пастаноў партыі і ўраду.

...енеральная ўборка вагонаў па...абуе вялікіх грашовых затрат. ...а ініцыятыве газеты да VII з'езда ...ветаў, брыгада правяла суботнік ўборцы. Такая-ж праца была ...раведзена і ў часе кампаніі асенне...мовых перавозак. Газета дабі...ся таго, што кожнай работніцай ...ў узят абавязак: на працягу трох ...есяцаў адвесці тры дні для ўборкі ...айго поезда. Пры дапамозе газе...ы, узятыя абавязкі былі выкананы ...брасумленна і своечасова.

За ўвесь час на брыгаду не бы...ні адной скаргі, ні аднаго акта ...дрэннае абслугоўванне пасажы...аў і трыманне поезда. Яна мела ...олькі добрыя водгукі. Не было ніводнага дэфэкту, ніводнай ад...цэпкі па віне змазчыкаў. Уся бры...гада ўдарная. Праца брыгады цал...кам арганізавана на аснове соц...спаборніцтва і ўдарніцтва. Соцспа...борніцтва разгорнута як паміж брыгадамі, так і ўнутры брыгад. Работніцы аднаго вагона спаборні...чаюць з работніцамі другога ваго...на. Ход і вынікі соцспаборніцтва асвятляе газета. Пастаноўка працы ў іх вагонах з'яўляецца паказальнай. Аб гэтым выразна гавораць водгукі пасажыраў і рэвізіі другіх брыгад.

Ударніца—праваднік тав. Рубах сваёй упартай і настойлівай работай дабілася таго, што членствам АСО і МОПР'а ахоплена ўся брыгада. Соцыялістычныя метады работы палепшылі не толькі якасць работы, але і агульна-культурны ўзровень работніц.

Уся работа брыгады асвятляецца ў насценгазеце. Газета з'яўляецца актыўным барацьбітом і арганізатарам брыгады на паспяховае выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній.

Але побач з поспехамі неабходна адзначыць, што газета не змагла дабіцца рэагавання на свае допісы па палепшаню соцбытавога абслугоўвання работніц, як-та: забеспячэнне брыгады гарачай стравай у час паездак, своечасовай выдачы спецоўкі, падача вугалю ў вагоны і т. д.

Тав. Дудо з'яўляецца актыўным рэдактарам сваёй газеты, яна-ж і прафорг брыгады. Лепшая ўдарніца-зотаўка. З працы тав. Дудо павінны ўзяць прыклад астатнія брыгады.

Самуйлава.



Зверху ўніз тт. **Жураўлева**—рэдактар Крычаўскай газеты, **Альферык**—фабрыка імя Дзяржынскага, **Зеневіч**--калгас імя Варашылава, **Карвянова**—фабрыка „Х Окцябр", **Паплаўская**—Гомельскі вагонны ўчастак.

РЭДАКТАР МАНЯ

В. К—скі.

Маня Вярбіцкая, размахваючы газетай, убегла ў цэх.

— Вы бачылі, дзяўчаты, што пішуць пра нашу брыгаду. Гэта-ж ганьба... Сталінская брыгада... і раптам наце вам—дрэнна працуе. Ян разгортвае газету «Сцяг Окцябра», дзяўчаты згуртаваліся вакол яе. Капусціна вырывае ў яе газету: «дай глянуць». Газета пераходзіць з рук у рукі. Нарэшце Ермаловіч чытае ўслух:

— Першым падарункам з'езду ад чырвонасцяжнага калектыву фабрыкі «Окцябр» з'яўляецца датэрміновае высокаякаснае выкананне гадавога промфінплана да 12-га снежня 1934 года на 103,1 проц. Падрыхтоўка да з'езду советаў адзначылася таксама магутным ўздымам зотаўскага руху. Тэхэкзамен здалі на «выдатна»—128 зотаўцаў. Зараз на-нова арганізаваны 24 гурткі па вывучэнню тэхмінімуму, якія ахапляюць 800 чалавек і два гурткі для далейшай вучобы зотаўцаў. Выпушчан першы нумер тэхнічнай-газеты «Сцяг Окцябра»...

— А дзе-ж пра нашую брыгаду?—загаманілі дзяўчата.

— Чакай! Зараз... І ўсе ўслухоўваюцца.

«Але фабрыка мае яшчэ рад недахопаў і вузкіх месц. Побач з лепшымі брыгадамі, якія першымі прышлі к фінішу па аўладанню фасонамі (брыгады 461 і 263 фасонаў), мы маем больш адстаючыя брыгады»...

Маня непакойліва пазірае на дзяўчат. Усе нецярпліва, настарожана чакаюць таго моманту, калі пачуюць пра сваю брыгаду. І раптам прагучэлі цяжкія, ганьбуючыя словы:

«Асабліва неабходна падкрэсліць дрэнную працу сталінскай брыгады, якая не выконвае ўзятых на сябе абавязацельстваў да з'ездаў советаў (майстар Крыгэль, парторг Кац, прафорг Сельц), а таксама і з'ездаўскай брыгады (майстар Кац, парторг Кірзнер, парторг Сонкіна)...

І гэтыя ганьбуючыя словы патокам каціліся па лентах, цэхах, па фабрыцы. З гэтымі словамі сустракалі іх ў парткоме, у заўкоме, у рэдакцыі шматтыражкі. «Г а н ь б а».—Здавалася чулася ў працяжным голасе фабрычнага гудка.

Электратак уключан. Засакаталі машыны. Захадзілі па паверхні выкрояў прасы. Над сталамі вырысоўваюцца рухі рук. У руках Мані паблісквае іголка. Яна спрытна абкідвае рукавы. Адно пальто змяняецца другім. Дваццатае, сарокавое...—Даць норму—і больш. Не сорак тры, а сорак шэсць пальто дала комсамольская лента за гэты дзень.

— Звыш плана тры пальто ёсць, таварыш Крыгель!—з усмешкай задавальнення прамовіла Маня.

Увечары Маня склікае рэдкалегію сваёй штодзёнкі. Абмяркоўваюць, выпраўляюць заметкі, спрачаюцца.—Трэба больш, не шкадуючы біць віноўнікаў прарыва, адстаючых, бракаробаў. От заметка пра бракароба Аляхновіч.—Пішы! Голуб Х. старанна выводзіць кожную літару загалоўка «зрыўшчыкі промфінплана». А пад загалоўкам—«работніца Аляхновіч, выцягваючы намётку, парвала ў пяці пальто петлі і гэтым самым нанесла вялікую страту нашай брыгадзе, зрабіўшы вялікі процант браку. Трэба, каб брыгада прыгледзелася да яе работы, пры праверцы ўдарнікаў выключыла з радоў ударнікаў». А побач у чырвоным спісу напісалі прозвішчы лепшых ударнікаў—Шляпліцкай, Ладышава, Файгенбоген.

Назаўтра брыгада чытае ўказанні газеты, як выйсці з прарыва. Парторг Кац склікае сход. Брыгада абвяшчае штурм. Замест 43 пальто па плану, узялі на сябе абавязак выпускаць 50 пальто ў дзень. Да 20 студзеня ліквідаваць прарыў. Маня цікавіцца ходам работы брыгады 46 фасона. У перапынку яна гутарыць з рэдактарам Кісялёвай. Абмяркоўвае папярэднія вынікі спаборніцтва між іх брыгадамі. Пасля работы Вербіцкая са сваімі таварышкамі—рабкоркамі спяшаецца на рабкораўскі семінар, які разгарнуў сваю работу ў сувязі з падрыхтоўкай да 3-га ўсебеларускага рабселькораўскага з'езда. У яе брыгадзе 12 рабкораў. І яны ўсе, як адзін наведваюць семінар.

Пасля заняткаў семінара Маня кліча майстра Крыгеля і яны сядзяць над заметкай у шматтыражку «Сцяг Окцябра».

«Адной з перадавых брыгад першага цэха,—пішуць яны,—лічылася комсамольская... Але з пераходам на летні сезон, брыгада апынулася ў прарыве з прычыны няправільна пабудаванага тэхналагічнага працэса... Неабходна адзначыць слабае кіраўніцтва трыкутніка... Штодзённа выпускаецца газета, якая асвятляе ўсе недахопы і мабілізуе масу на хутчэйшае знішчэнне іх. Брыгада ў часе з'езда абавязуецца выйсці з прарыва і да 20 студзеня прыйсці са 100 проц. выкананнем плана». Трыкутнік адгукнуўся на заметку, шматскладаныя аперацыі разгрузілі. Узмоцненая тэхвучоба, барацьба з бракаробамі далі магчымасць да вызначанага тэрміну план выканаць. Да першага лютага сталінская брыгада прышла з вышэйшым паказальнікам—109,4 проц. А брыгада, дзе рэдактарам працуе Кісялёва—на 114,6 проц.

Аднойчы ў сталоўцы Вярбіцкая сустрэлася з Барыбінай і Кісялёвай. Гутарка зайшла пра шматтыражку «Сцяг Окцябра».

— А спрытная наша рэдактарша Памеранц. У яе работа пастаўлена па-баявому. Газета мабілізуе рабочы калектыў на выкананне планаў. Паказвае работу лепшых ўдарнікаў, бічуе адстаючых, рвачоў, бракаробаў. Змагаецца за партыйную і тэхнічную вучобу. Газета абвяшчае жорсткую барацьбу класаваму ворагу. Выкрыт белагвардзеец—трацкіст Кроцін, трацкіст Шкляр і інш. І газета мабілізуе ўвагу рабочага калектыва на ўзмацненне класавай пільнасці.

Своечасова распачата падрыхтоўка да з'езда рабселькораў. От артыкул: «25-га лютага склікаецца трэці ўсебеларускі з'езд рабселькораў... Падрыхтоўка да з'езда павінна прайсці пад лозунгам выканання промфінплана... З 15 па 25 лютага правесці перавыбары рэдкалегій, самаправерку работы штодзёнак. Праглядзець, як газета змагаецца за асваенне летніх фасонаў, за выкананне плана, за аўладанне тэхнікай. Як газета выяўляе і рэагуе на лодыраў, рвачоў, бракаробаў і сімулянтаў....»

І пачалася самаправерка штодзёнак. Вярбіцкая правярае газету Кісялёвай, а Кісялёва газету Вярбіцкай. Барыбіна бярэ для праверкі газету Капусцінай. Усяго на фабрыцы ў асноўных цэхах 25 штодзёнкі, а з падсобнымі цэхамі—35. І 35 рэдакта-

роў гэтых штодзёнак са сваімі брыгадамі ўзяліся за самаправерку. Вось Вярбіцкая піша ў «Сцяг Окцябра» вынікі сваёй праверкі:

«Газета рэдактара Кісялёвай на сваіх старонках паказвае асобных парушыцеляў працдысцыпліны, як Фаерштэйн, Фітэрштэйн. Таксама рабочых, якія давалі дрэнную якасць, як Гінзбург, Стронгіна, Кукес, Улаховіч. Але відаць, што трыкутнік своечасова не рэагаваў на ўсе допісы. Для прыкладу возьмем работу Улаховіч, якая на працягу некалькіх дзён давала дрэнную якасць. Аб гэтым газета пісала, а трыкутнік не прымаў ніякіх мер. «Таксама газетай быў дан адпор антысовецкай вылазцы работніцы Шпарбер».

1-га лютага на фабрыцы адбывалася прэміраванне ўдарнікаў. 120 лепшых ўдарнікаў фабрыкі атрымалі прэміі. Прэміраваны Вярбіцкая і Кісялёва, як лепшыя ўдарніцы-зотаўкі, лепшыя рэдактары газет. Усяго прэміравана пяць рэдактароў штодзёнак. За добрую пастаноўку работы ў барацьбе за пяршынство ў спаборніцтве з Украінай Наркамесцпромам прэміравана фабрычная газета «Сцяг Окцябра» і яе рэдактар Памеранц. Газеты ў часе падрыхтоўкі да рабселькораўскага з'езда яшчэ больш разгарнулі сваю работу. Яны мабілізуюць рабочы калектыў на вышэйшае і лепшае выкананне плана. За 7 дзён лютага фабрыка выканала на 106,3 проц. Двум новым брыгадам (335 і 436 фасон) за вышэйшае выкананне планаў надалі ганаровую назву ім. тав. Сталіна. У перадавых радах ідуць і брыгады Вярбіцкай і Кісялёвай. Газеты яднаюць вакол сябе новыя кадры рабкораў. За апошні час лік рабкораў узрос з 200 да 281 чалавека. З 11-га лютага пачаліся перавыбары рэдактароў. Перавыбары ператварыліся ў масавую праверку работы газет і іх рэдкалегій. Вярбіцкая, Кісялёва і Барыбіна ўжоў абраны рэдактарамі штодзёнак.

ГАЗЕТА—ЗМАГАР ЗА КАЛГАСНУЮ РАДАСЦЬ

У жорсткай класавай барацьбе з кулацтвам і яго падпявалами нарадзіўся ў 1929 годзе калгас „Дзяржынскі". Нарадзілася і газета „За большэвіцкі калгас."

З першых-жа дзён насценгазета пачынае бічаваць ілжэкалгаснікаў, лодыраў, рвачоў, вядзе актыўную барацьбу за ўдарныя тэмпы работы, за ўмацаванне калгаса. Яна мабілізавала калгасныя масы на баявую работу ў калгасе. Арганізавала калгасны актыў вакол газеты з ліку лепшых ударнікаў. Першай актывісткай была Будай Волька.

Грамадская работа цесна звязвала Вольку з рэдакцыяй і праўленнем.

Лепшую ўдарніцу Будай Вольку абралі членам рэдкалегіі насценгазеты. З гэтага часу Волька пачынае не толькі падаваць допісы, але арганізоўваць працу газеты і рэйды па праверцы работы калгаса.

У 1934 годзе, як насценгазета, так і штодзёнкі разгортваюць актыўную барацьбу за падрыхтоўку і правядзенне пасяўной і ўборачнай. Паказваюць лепшых ударнікаў і бічуюць адстаючых, гультаёў, зрыўшчыкаў работы.

Газета своечасова ўзварушыла масы калгаснікаў на баявую падрыхтоўку да касавіцы і жніва. А калі распачалася работа, газета сачыла за якасцю ўборкі кожнай брыгады, кожнага калгасніка ў паасобку. Будай Арсэн,—піша газета—норму перавыканаў на жнеярцы, замест чатырох га—зжынае зерневых 5,5 га ў дзень. Будай Сцяпан ганебна адстае. Выканаў 3,8 га. Папсаваў шасцярню ў жнеярцы—бракароб. Яму патрэбна вучыцца ў Арсэна.

Надыходзіла асенняя сяўба і ўборка бульбы. Газета сігналізуе: „Перадавыя брыгады ўжо гатовы. Яны расставілі сілы, склалі планы. Другая брыгада (брыгадзір Будай Сымон) расставіла сілы з разліку—32 га бульбы выкапаць за 10—12 дзён. Першая і трэцяя брыгады бярыце прыклад з другой брыгады",—пісала газета.

Па ініцыятыве насценгазеты праўленне калгаса склікае сход ударнікаў. Сход пастанаўляе: скарыстаць усе сілы на асеннюю сяўбу і копку бульбы. Рэдкалегія выпускае экстраны нумар брыгадных газет „За пяршынство". Праз газету, брыгады выклікаюць адна другую на соцспаборніцтва.

Ударніцтва з кожнай баразной і з кожным гектарам копкі бульбы і сяўбы ўсё больш і больш разгортвалася. У выніку—кампаніі былі праведзены своечасова і добраякасна.

Газета своечасова ўзнімае пытанні аб размеркаванні ўраджаю, аб падрыхтоўцы да зімы. Рэдкалегія вылучыла Будай Вольку ў камісію па праверцы гатоўнасці да зімы. Па сканчэнню праверкі, Будай далажыла праўленню аб выяўленых недахопах. І калгас прыступае да ацяплення хлявоў, канюшні, да ачысткі насен-фонда.

Газета арганізуе культпаход, барацьбу за культурны быт калгаснікаў. Праверан быт лепшых людзей калгаса. Вось—Хацько Марына—былая батрачка, лепшая ўдарніца-даярка. Мае 650 працадзён. Жыдовіч Наталія—таксама ў мінулым батрачка. У калгасе з 1929 года. Кожны год прэміруецца за ўдарную работу. За 1934 год мае 260 працадзён. Выяўлена, што ў іх жыллёвыя ўмовы не надта добрыя. Для лепшых калгаснікаў—лепшыя ўмовы! І Хацько Марыне адрамантоўваюць хату, а Жыдовіч Наталлю пераводзяць у нова-пабудаваны дом. Па ініцыятыве газеты арганізоўваюцца гурткі партыйна-комсамольскай вучобы. Абсталявана радыёаўдыторыя. Праведзен рэйд па праверцы догляду жывёлы, захавання маладняка і падрыхтоўкі да вясны. Аб выніках рэйда Валасевіч дакладае сходу калгаснікаў, што ацёлу, ажаробу і апаросу наладжан клапатлівы прыём. Устаноўлена кругласутачнае дзяжурста. Як цяляты, так і ягняты ў добрым выглядзе.

Коні вышэй сярэдняй упітанасці. Кармамі забяспечаны. На час пасяўной для коней забраніраваны канцэнтраваныя кармавыя фонды. Насенныя і страхавыя фонды засыпаны чыстыя і добраякасныя. Інвентар адрамантаваны.

Наважылі да часу веснавых работ адчыніць яслі. На курсы работнікаў ясляў паслалі лепшую ўдарніцу Будай Вольку. У час падрыхтоўкі да 3-га Усебеларускага з'езда рабселькораў газета яшчэ больш ажывіла работу. Вярбуе і гартуе вакол сябе новых селькораў. Дагэтуль на гэтым участку было не вельмі добра, налічвалася ўсяго 9 селькораў. Зараз газета паставіла пытанне: „кожны ўдарнік—селькор, кожны селькор—ударнік". Лепшыя ўдарнікі адклікаюцца. Хто малапісьменны, ён ідзе за дапамогай да таварыша. Парторг Сарокін сядзіць з імі, паказвае, вучыць і дапамагае ім пісаць заметкі.

Бухцілаў.

Дэлегаты ад БССР на 2-гі Ўсесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Справа налева т. т.: **Кішчэнка А.** (к-с „Макрс", Лепельскі р-н), **Марозава К.** (к-с „Адказ ворагам", Лёзненскі р-н), **Рэдзько П.** (к-с ЦВК, Пухавіцкі р-н), **Вечыстая П.** (к-с „Комінтэрн", Магілеўскі р-н), **Касперовіч Ш.** (к-с „Пробуждение", Смалевіцкі р-н), **Малахава Н.** (к-с імя Леніна, Гомельскі р-н), **Кавалёва М.** (к-с „Новае жыццё", Барысаўскі р-н), **Талстая П.** (к-с імя Варашылава, Бешанковіцкі р-н).

Іг. Л—іч

У штаб большэвіцкіх перамог—у Маскву!

Дыміцца гарачы чай. Залаціста-ружовае пячэнне прыгожымі прыгорачкамі раскладзена па талерках. Малы пакойчык, але затое на душы прасторна. Так і напрошваецца пагаворка,—і хтосці з гасцей бойкім, маладым голасам сказаў: «Хоць і цесна, ды ўцешна».

— І сапраўды, раней працавалі кожны сам сабе, межамі зямлю аддзялялі і ўсё не ладзілі—зайздросцілі адзін аднаму, а цяпер у калгасе, на адным полі, за адным сталом і жывем дружна,—гаворыць самая старэйшая, тав. Ганчарова.

Так пачыналася раніца 8-га лютага ў рэдакцыі журнала «Работніца і калгасніца Беларусі». Тут, за сталамі, засланымі чыстымі, белымі абрусамі, за чашкай гарбаты, сабралася вялікая калгасная сіла жанчын—дэлегаткі ад БССР на другі Ўсесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў. З ліку 35 дэлегатаў, ад БССР на з'езд едзе амаль палова жанчын—14 чалавек. Ініцыятыва рэдакцыі,—сабрацца для прапрацоўкі даклада наркома Земляробства СССР тав. «Чэрнова на VII Ўсесаюзным з'ездзе саветаў,—была жвава падтрымана калгасніцамі-ўдарніцамі.

І вось сабраліся. Ім насустрач і раніца вышла такая сонечная, такая-ж яркая, як і радасць гэтай сустрэчы.

* * *

Дыміўся гарачы чай. Ішла жвавая гутарка.

— «Важнейшай задачай сельскай гаспадаркі з'яўляецца зараз пад'ём жывёлагадоўлі»,—сказаў тав. Молатаў на VII Ўсесаюзным з'ездзе саветаў. Выконваючы запаветы Леніна, пад кіраўніцтвам тав. Сталіна, партыя ставіць перад намі гэтую задачу, вылучае яе, як «галоўнае звяно, за якое патрэбна ўхапіцца» нам заража з мэтай яшчэ большага развіцця вытворчых сіл соцыялістычнай сельскай гаспадаркі. Чотка, у нямногіх словах аб гэтым расказала калгасніцам работніца журнала тав. Ючкова.

Наша эканамічная, гаспадарчая магутнасць з'яўляецца лепшым залогам абароназдольнасці СССР. Задача: узняць жывёлагадоўлю—гэта значыць выгадаваць найбольш пародзістай жывёлы, павялічыць і ўзмацніць цягавую сілу, вырасціць і захаваць каня.

Перад намі гэтая задача ўстае яшчэ вастрэй, бо вы ведаеце, што нашай БССР—рэспубліцы, якая стаіць на мяжы з капіталістычнай Еўропай, давядзецца на выпадак вайны прыняць першыя бойкі. Мы, будуючы і ўзмацняючы нашу гаспадарку, павінны кожную мінуту памятаць словы тав. Сталіна: «Мы стаім за мір і адстайваем справу міра. Але мы не баімся пагроз і гатовы адказаць ударам на ўдар падпальшчыкаў вайны»,—коратка і ясна гаворыць прадстаўнік Наркамзема БССР.

Дэлегаты ад БССР на 2-гі Усесаюзны з'езд калгаснікаў-ударнікаў. Справа налева т. т.: **Кузняцова М.** (к-с „Зара", Шклоўскі р-н), **Саўчкова Н.** (к-с „Чырвоная Зорка", Бялыніцкі р-н).

Калгасніцы жвава пачалі расказваць аб становішчы жывёлагадоўлі ў калгасах, аб доглядзе жывёлы і захаванні маладняка і аб усім жыцці і рабоце калгасаў.

Жыццё калгаса—гэта ёсць іх жыццё. Вось дэлегатка Лепельскага раёна, з калгаса «Марс» тав. Кішчэнка, былая бяднячка—яна ўступіла ў калгас з першых-жа дзён яго арганізацыі. За ўвесь час прабывання ў калгасе яна добра працавала. І ўсямерна ўмацоўвала гэты калгас. Быў момант, калі з калгаса выходзілі некаторыя хісткія элементы. Тав. Кішчэнка, як адданая калгасніца, была ўпэўнена ў тым, што калгасны лад пераможа і яна змагалася за яго ўмацаванне. З 9 гаспадарак у 1928 годзе да сённяшняга дню калгас вырас да 102 гаспадарак. План паставак дзяржаве па ўсіх відах выканан датэрмінова. Калгас «Марс» з'яўляецца перадавым ва ўсім раёне. Тав. Кішчэнка з'яўляецца лепшай ударніцай, выпрацавала 402 працадні. Працуе на ферме даглядчыцай цялят. Цяляты ў добрым выглядзе. За ўдарную работу не аднойчы прэміравана.

Побач з ёю тут-жа сядзіць адна з пажылых калгасніц—тав. Ганчарова Александра. Да рэволюцыі, з 12-гадовага ўзросту яна батрачыла. У 1931 годзе ўступіла ў калгас «Гігант», Сіроцінскага раёна, Дабельскага сельсовета.

З пачатку ўступлення ў калгас Ганчарова з'яўляецца лепшай ударніцай. Кожны год па дватры разы прэміруецца. У 1934 годзе выпрацавала 211 працадзён, а разам з мужам—534. Як лепшая ўдарніца была ў 1934 годзе

на Ўсебеларускім злёце калгасніц-ударніц. Зараз яна з'яўляецца членам РВК. На працягу 1934 года была членам праўлення калгаса.

Пакуль крыху астыне гарбата, яна расказвае аб становішчы жывёлагадоўлі ў іх калгасе.

— Наш калгас за апошнія гады значна вырас і ўмацаваўся. З кожным годам развіваецца і жывёлагадоўля. Калі раней у часе арганізацыі калгаса было толькі 10 кароў, то зараз мы маем 30 дойных, 30 нецеляў і 20 цялят. Як каровы, так і цяляты дагледжаны добра. Маюць сярэднюю ўпітанасць. За 1934 год адыходу не было. Па плану ўкамплектавання стада ў гэтым годзе патрэбна было паставіць на ферму 100 галоў, а мы паставілі—120.

У гутарку ўступае Сафонава Таццяна. Удумчыва і бадзёра гучыць яе голас. Ёю ганарацца не толькі калгасніцы і калгаснікі Жлобінскага раёна, дэлегатам ад якіх яна выбрана на з'езд,—такімі ганарыцца ўся Совецкая Беларусь. Яна з тых бяднячак, якія калісці ледзь трымаліся пры зямлі. Яна першая ў 1927 годзе ўступіла ў калгас «Рассвет-Пераможца», Майскага сельсавета. Яна пачынальніца і лепшая ўдарніца на ўсіх участках работы свайго калгаса. Яе брыгада



Дэлегаты ад БССР на 2-гі Ўсесаюзны з'езд калгаспікаў-ударнікаў. Справа налева т.т.: **Сафонава Т.** (к-с „Рассвет-Пераможца", Жлобінскі р-н), **Ганчарова А.** (к-с „Гігант", Сіроцінскі р.), **Глушэц А.** (к-с імя Кірава, Нараўлянскі р-н).

выконвае свае заданні амаль кожны раз датэрмінова. Тав. Сафонава, вылучаная брыгадзірам на свінатаварную ферму, дабілася таго, што адыход маладняка быў даведзен да нуля. За добрае захаванне свінога пагалоўя калгас і РВК прэміравалі Сафонаву некалькі разоў.

Пасля Сафонавай выступаюць і ў сяброўскай гутарцы расказваюць іншыя калгасніцы-ўдарніцы пра свой калгас, пра становішча жывёлагадоўлі ў іхнім калгасе, як калгасніцы на справе спраўляюцца з задачамі, пастаўленымі перад імі партыяй.

Так прайшла прапрацоўка даклада Наркамзема СССР т. Чэрнова, якая была пераплецена жывымі расказамі калгасніц-ударніц аб сваёй рабоце.

Гэта непасрэдная сустрэча яшчэ больш умацавала сувязь журнала з перадавымі барацьбітамі за калгасны лад, а праз іх і з усёй масай калгасніц.

Шчыра і проста прайшла гутарка. «Сёння ўвечары едзем у Маскву!»—І гэта гучэла надзвычайна радасна.—У Маскву!—Гэта цвіло ўсмешкамі, гэта гарэла ў вачах.—У Маскву!—Біліся сэрцы. І гэта радасць зразумела, бо многія з іх не толькі ў Маскве, але нават у Менску былі першы раз за ўсё сваё жыццё. Яны вязуць з сабой для паказа з'езду ўзоры сваёй калгаснай прадукцыі.

— У Маскву!—У штаб большэвіцкіх перамог! У Маскву!

— Мы даложым з'езду пра нашу работу, пра нашыя перамогі. Мы, ударніцы калгасных палёў Совецкай Беларусі, запэўнім яго ў тым, што клятву, якую тав. Сталін даў Леніну, армія калгаснікаў і калгасніц выканае.

Сем пісем Екацерыне Кульба

Восем дзесяткаў раскінутых у беспарадку хат складаюць вёску Скарынічы, Менскага раёна. Калгас тут існуе з 1930 года і носіць назву «Чырвоныя Скарынічы». Членам праўлення яго—Екацерына Якаўлеўна Кульба.

Слава ідзе аб гэтым калгасе па Беларусі. Не сеялі ніколі ў гэтых мясцах пшаніцы. А ў гэтым годзе калгас сабраў яе па 14 цэнтн. з гектара, жыта—12 цэнтн. і бульбы—130 цэнтн.

Разлічыўся калгас з дзяржавай 15-га жніўня, з машына-трактарнай станцыяй—20 жніўня. На працадзень выдаў па 4 кгр. адных зернавых. Па 19 кгр. бульбы і гародніны, выдаў і корм для жывёлы.

Ідзе слава і аб ферме калгаса ў 130 галоў і аб тым, што бескароўных у гэтым калгасе не засталося.

Екацерына Якаўлеўна працуе цялятніцай. З таго часу, як прыняла цялятнік, не было ў яе ніводнага выпадка прапажы цялят. Зараз Екацерына Якаўлеўна ў Маскве. Была яна дэлегатам на VII Усесаюзным з'ездзе Советаў і засталася ўдзельнічаць у работах другога Ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў - ударнікаў. У апошнія дні Екацерына Якаўлеўна Кульба атрымала з роднага калгаса рад пісем ад калгаснікаў і калгасніц з наказамі і прапановамі—аб чым сказаць на з'ездзе. Частку гэтых пісем мы ніжэй і публікуем.

* * *

Дарагая Каця!

Як даведалася я, што ты будзеш удзельнічаць на Ўсесаюзным з'ездзе калгаснікаў-ударнікаў, дык я і наважыла табе напісаць пісьмо. І вось аб чым. Памятуеш, у мінулым годзе гэта было, прыязджаў да нас у вёску дырэктар машына - трактарнай станцыі. Даехаў ён да хаты Станішэўскіх і стоп. Машына ні ўзад ні ўперад. Завязла ў гразі. Усёй вёскай выцягвалі.

Цяпер зноў каля дома Жукоўскіх не лепш. Ты думаеш, ад чаго-б гэта. Калгасы яшчэ мала надаюць ўвагі культурнаму будаўніцтву вёскі. Вось запісалі-б вы там на з'ездзе, што арцель абавязана клапаціцца аб добрабыце вёскі. Глядзі і справа бы хутчэй рушылася.

І зноў такая справа. Вазьмі ты нашы калгасы. Ну, хоць вазьмі арцель «Чырвоны партызан», ці імя Фалько. Яны-ж вунь як па хутарах раскіданы, а ці мала ў нас такіх. Сама-ж ведаеш, як цяжка прыходзіцца ім арга-

зоўваць. Многа тут ўсякіх цяжкасцей. Далей такое становішча цярпець нельга. Калгаснікі самі гэта становішча пачынаюць разумець і імкнуцца сабраць свае двары ў адну вёску. Толькі вёску цяпер неабходна будаваць пановаму. Ты, Каця, папрасі там архітэктараў,—няхай зоймуцца нашымі калгасамі. Яны могуць нам дапамагчы будаваць калгасныя вуліцы з алеямі і садамі, будаваць добрыя дамы.

Шлю табе калгаснае прывітанне.

Марыя Мураўская.
(Калгасніца-ўдарніца).

* * *

Каця!

Паведамляю табе аб вялікай навіне: пачаўся ў нас на ферме ацёл. З'явілася ўжо новых пяць цялят—моцныя, здаровыя. Можаш смела сказаць з'езду, што мы абяцаем захаваць і выгадаваць увесь прыплод, які атрымаем.

Што датычыцца тваіх цялят, то ты не хвалюйся. Твае цяляты ў парадку. Вясёлыя, сытыя, чыстыя. Пакуль ты на з'ездзе, я іх даглядаць буду. А ты ўжо там ўсё добра выслухай і нам потым раскажы.

Ад мяне старой ты скажы там каму след. Жывёла ў нас з году ў год прыбывае, а ветэрынараў і фельчароў мала. Па маему, трэба арганізаваць у кожным раёне пункты хуткай дапамогі для жывёлы. У многіх калгасах ёсць цяпер тэлефоны. Пазваніл на пункт—глядзі-ж у хуткім часе фельчар ці доктар прыедзе. Каб хутчэй справа была, добра было-б даць ім аўтамабіль ці добрага каня. Словам так трэба паставіць справу, каб было так як у горадзе з хуткай дапамогай людзям.

Вось ты аб гэтым абавязкова скажы...

Марфа Лічко
(Інспектар па якасці).

* * *

Паважаная Екацерына Якаўлева!

Наказ табе мой будзе такі. Як я ёсць загадчыкам фермы, зразумела, што першае слова ў мяне аб жывёле. Чыталі мы тут стары статут сельгасарцелі. Там пра жывёлагадоўлю мала сказана. А зараз жывёлагадоўля на першы план выходзіць. Значыць, і ў статуце запісаць трэба, што калгас бярэцца гадаваць жывёлу і выконваць план жывёлагадоўлі, дадзены дзяржавай. Потым неабходна не забываць і аб кармах. Без многагадовых і аднагадовых траў і кораньплодаў абыйсціся нельга. Арцель павінна і аб гэтым паклапаціцца, а на паследак вось яшчэ аб чым хачу табе напісаць. Ты стада наша, небось, не забыла. За мінулы год атрымалі мы ад каровы па шэсць літраў малака ў дзень. Куды гэта варта. Не толькі мы, а і кожны калгас павінен моцна падумаць наконт племяннай жывёлы. І ў статуце новым трэба было-б запісаць, каб арцель аб гэтым клапацілася.

Вось табе і ўвесь мой наказ.

Нікалай Русаловіч
(Загадчык малочна-таварнай фермы).

* * *

Дарагая Екацерына!

Прымі маё прывітанне і пажаданні актыўна ўдзельнічаць у рабоце з'езда калгаснікаў-ударнікаў. Аб тваім Толі можаш не турбавацца. Адчувае ён сябе добра. Есць з апетытам, возіцца на саначках, спіць моцна. Часта пытае ў мяне: «Калі мама прыедзе». Просіць цябе купіць яму забаўную цацку ў Маскве.

Пішу табе гэтае пісьмо і думаю: у новым статуце сельскагаспадарчай арцелі трэба было-б спецыяльна запісаць, што кожны калгас павінен мець яслі і дзіцячыя пляцоўкі. І не часовыя, а пастаянныя. Вось і ў нас у калгасе былі яны, ды сплылі. А памяркуй сама, колькі-б рук нашых жаночых вызвалілася для работы ў калгасе.

Ну, я спяшаюся на заняткі. Муж твой кланяецца табе. Ён як і раней добра працуе. Бывай здарова!

Твая Наталля Матюта
(Настаўніца).

* * *

Тав. Кульба!

Прашу я цябе ад імя ўсёй другой брыгады. Пашукай ты ў Маскве добрыя і не дарагія кормазапарнікі. Бульбу даваць жывёле так, як мы даем, нікуды не варта. Яе запарваць трэба. Ад гэтага жывёла здаравейшай будзе. Не можа таго быць, каб заводы нашы кормазапарнікаў не рабілі. Так што ты ўжо для ўсяго калгаса пастарайся.

Мураўскі Антон
(Брыгадзір 2-й брыгады)

* * *

Добры дзень, Каценька!

Сабраліся мы тут 4-га чысла і талкавалі наконт другога з'езда ўдарнікаў-калгаснікаў. Перачытвалі мы і стары статут калгаса. Вось што, Каценька, я думаю: малавата ў статуце сказана наконт агратэхнікі. Па моему, раз калгас, дык ужо ўсё павінна быць па-калгаснаму. Паглядзіш на іншыя палі, як выраблены—сорам адзін. Раз, па-моему, арцельна ўзяліся, дык ужо трэба весці справу па ўсіх правілах, як нашыя аграномы кажуць. І адказваць усёй арцеллю. Так бы трэба і ў новы статут запісаць.

Асабліва не забыцца наконт насення. Так проста і запісаць, што калі арцель сее неачышчаным насеннем, якое толькі шкоднае зелле нам разводзіць, дык з гэтай арцелі строга спагнаць.

Ураджаі нашы павінны быць найлепшымі, хто аб гэтым не клапаціцца, таму і на полі рабіць няма чаго.

Зося Чуеўская
(Інспектар па якасці).

* * *

Кацярына!

У мяне да цябе наступная просьба. Ачыстка насення і радавая сяўба—першаісная справа для павышэння ўраджайнасці. Аднак трыераў і радавых конных сеялак мы да гэтага часу дастаць для калгаса не можам. Ці то іх не хапае, а вярней за ўсё, яны заляжаліся дзе-небудзь на складах. Трэба, каб гэтыя машыны былі ў калгасе. Ты распытайся добра аб гэтым у Маскве, а ў выпадку чаго ты і на з'ездзе скажы.

Сцяпан Жыгалка
(Калгаснік палявой брыгады).

(Гэтыя пісьмы ўзяты з газеты „Правда")

Добрая работа — залог поспехаў

У барацьбе за рэалізацыю рашэнняў XVII з'езда партыі аб уздыме жывёлагадоўлі, калгас «1-е мая» дасягнуў вялікіх поспехаў. У калгасе ёсць дзве жывёлагадоўчыя фермы МТФ і СТФ.

Малочна-таварная ферма з'яўляецца адной з перадавых ферм раёна. На ферме налічваецца дойных кароў 102 і маладняка 150 галоў. План мясапастаўак 65 цэнтнераў, малакапастаўак—63 тысячы літраў ферма выканала датэрмінова. План укамплектавання фермай выканан і перавыканан. Па плану ў 1934 г. ферма павінна мець 180 галоў, маецца 220 галоў. Праведзена вялікая работа па гадоўлі маладняка. У 1934 г. ад 108 ацёлаў на ферме выгадавана 102 цялят.

Да зімоўкі жывёлы ферма падрыхтавалася своечасова. Ацеплена памяшканне, паслана столь, зашклёны вокны, зроблены жолабы. Складзены кармавы баланс і кармы пераданы ў распараджэнне загадчыка тав. Мукасея. Па балансу ферма атрымала кармоў: сена—3100 цэнтн., буракоў—2352 цэнтн., бульбы—295 цэнтн., зернавых—83 цэнтн.

Жывёлу даглядае спецыяльная брыгада з 6 лепшых калгаснікаў. На ферме ўведзена індывідуальная здзельшчына. Наглядчыцы (яны-ж і даяркі) працадні атрымліваюць ад колькасці надоенага малака ад ацёлу. За кожнай даяркай замацавана па 12 кароў. Гэты метад яшчэ больш павышае турботнасць аб добрым доглядзе кароў. Кожная даярка зацікаўлена, каб як больш надаіць малака, як лепш даглядзець жывёлу.

Праца на ферме пачынаецца у 5 гадзін раніцы і канчаецца ў 7—8 гадзін вечара. Уся работа праходзяць па строга-ўстаноўленаму распарадку. У 5 гадзін раніцы—раздача корму, потым даенне, чыстка, вадапой, зноў кармленне і т. д. На ферме заўсёды суха і светла. Па ўсяму кароўніку гарыць 15 лямпачак Ільіча. Каровы маюць добры выгляд. Кожны дзень праходзіць чыстка.

Зараз на ферме пачаліся ацёлы. Ужо ацялілася 15 кароў. Усе нарадзіўшыеся цяляты гадуюцца Да ацёлу ферма падрыхтавалася добра. Работнікі заключылі спаборніцтва паміж сабой на 100 проц. захаванне нарадзіўшыхся цялят. На ферме ўведзены кругласутачныя дзяжурствы. Даглядчыцы раней ведаюць, якая і калі карова будзе цяліцца, а таму апошнія дні за ёй наладжваецца асобны догляд.



Васілеўская Маня—лепшая даярка калгаса імя Закоўскага (Слуцкі раён). На ферме працуе тры гады.

Сярод работнікаў фермы праводзіцца масавая работа. Кожныя два тыдні праводзяцца вытворчыя нарады, на якіх работнікі абгаварваюць усе недахопы і намячаюць рацыён кармлення на другую палову месяца. На ферме рэгулярна выпускаецца насценгазета «За соцыялістычную жывёлагадоўлю».

Работнікі фермы абвязаліся ўвесь маладняк 1935 года выгадаваць, не дапусціць ні аднаго падзяжу цяляці. Залогам выканання гэтага абавязацельства з'яўляецца добрая работа.

Слуцкі раён. **Кучур.**

УДАРНІЦЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК

Перад калгасам «Інтэрнацыянал», Пухавіцкага раёна стаяла пытанне, як хутчэй выканаць план лесазагатовак. Мужчынскай рабочай сілы—недахоп.

Старшыня калгаса Гэля Тумашык разам з парторгам Пылаевым вядзе растлумачальную работу сярод калгаснікаў. Склікае сход. Абвяшчае бой зрыўшчыкам лесазагатовак. Наладжвае працдысцыпліну. Арганізуе брыгады з дзяўчат і жанчын.

— Мы пакажам усім, як трэба працаваць,—гаворыць Гэля. Дружна ўзяліся жаночыя брыгады за работу. Беражна, па-гаспадарску адносіліся яны да коней, не перагружалі іх.

Калгас «Інтэрнацыянал» выклікаў на соцспаборніцтва суседнія калгасы і першым датэрмінова выканаў план рэзкі і вывазкі лесу, за што атрымаў прэмію ад Леспрамгасу.

Лепшыя ўдарніцы: Шычко Вера, Воскабовіч Люба, Буглак Юзэфа не адставалі на рабоце ад мужчын. За лепшую, ўдарную работу яны прэміраваны.

М. Жук

* *

Жанчына ў калгасе—вялікая сіла. Жанчыны калгасаў «Новы шлях», Дубровскага сельсовета на лесазагатоўках таксама як і ў паляводчых і жывёлагадоўчых брыгадах з'яўляюцца прыкладам арганізаванасці і дысцыплінаванасці.

Жанчыны брыгады—лесарубаў у колькасці 19 чалавек, на чале з брыгадзірам тав. Макрыцкім, выконваюць устаноўленыя нормы, а паасобныя калгасніцы, як тав. Шульга Ганна, Дземідзенка Фядора, Макрыцкая Ганна, Шульга Тацяна, Ходзенко Насця дзённыя заданні значна перавыконваюць.

Калгасніца Юдзенко Тацяна кажа,—«я работаю ў лесе нараўне з мужчынамі і зарабляю да 4 рублёў у дзень. За добрую працу атрымліваю прэміі прамтаварамі. У калгасе свае абавязкі выконваю добрасумленна—вось і жыву добра і ганаруся гэтым».

Прыклад гэтых жанчын па лесазагатоўках і вывазцы павінны пераняць усе жанчыны—калгаснішы.

ПРОБНЫ ВЫЕЗД

Работу VII усесаюзнага з'езда советаў і падрыхтоўку да 2-га ўсесаюзнага з'езда калгаснікаў-ўдарнікаў, калгас «Першы Май» адзначыў ударнай падрыхтоўкай да вясны. Насенныя і страхавыя фонды засыпаны з лепшых гатункаў. Вывезена 6 тысяч вазоў гною. Да кожнай брыгады даведзен план веснавой сяўбы.

Сваю гатоўнасць да вясны калгас наважыў праверыць пробным выездам ў поле.

Вестка аб пробным выездзе хутка абляцела ўсіх калгаснікаў. Ад старога да малога ведалі ў калгасе «Першы Май», што 5-га лютага пробны выезд. Кожнаму хацелася, каб яго конь, воз быў лепшым на выездзе. Па некалькі разоў калгаснікі пераглядалі інвентар, чысцілі коней. Кожны брыгадзір дабіваўся, каб яго брыгада была лепшай.

Каля трактара хадзіў трактарыст, правяраў як ён гатоў для работы. Заліваў бензін, прабаваў ехаць.

***

На паседжанні праўлення калгаса брыгадзіры і калгаснікі абменьваліся вопытам падрыхтоўкі да вясны і заўтрашняга пробнага выезда.

Увечары разыходзіліся да дому брыгадзіры і калгаснікі. У кожным не выходзіла з галавы слова «пробны». Разам з усімі пайшоў і брыгадзір чацвёртай брыгады Цярэнці Нямковіч, але не да дому, а ў сваю брыгаду.—Адно дрэнна—разважаў сам з сабою Нямковіч—коні падвядуць, Варабей вінаваты,—запусціў іх, а зараз папраўляй. Не было часу паправіць. Усяго паўмесяца, як прыняў брыгаду, але хто гэта будзе ведаць, ніхто. Скажуць, што я вінават.

Хлопцы не спалі, як і брыгадзір. Нямковіч накіраваўся ў канюшню. Коні елі канюшыну.—«Ты Андрэй яшчэ пачысць коней»,—звярнуўся да конюха Нямковіч.

— Хто паедзе ўперадзе?—з усіх бакоў пасыпаліся пытанні Нямковічу.

— У каго будзе лепш пачышчаны конь, той паедзе,—адказаў брыгадзір.

Нямковіч не пайшоў адпачываць, не гледзячы на позні час, пакуль не праверыў сваімі вачыма ўсё.

***

Не спалася гэтую ноч і брыгадзіру Стругачу Сымону. Сёння ён устаў раней чым заўсёды і адразу накіраваўся ў брыгаду. Двор праўлення калгаса ўжо запаўняўся гоманам. Першым прышоў на канюшню Каплан Зісель. Вывеўшы свайго сівага, Зісель старанна чысціў яго... Калгаснікі падыходзілі да сваіх коней. Кожны стараўся лепш пачысціць свайго каня, хутчэй запрэгчы. З гаража даносіліся гукі матора. «Брыгада гатова»—рапартаваў брыгадзір Стругач, увайшоўшы ў праўленне.

Хутка прыехалі калгаснікі з брыгады № 4, а потым і № 5. Кожны цікавіўся праверыць, як падрыхтаваліся другія брыгады. Калгаснікі брыгады № 2 і 5 хадзілі і абглядалі, як падрыхтавалася брыгада Нямковіча. Коні стаялі па парах, у кожнага новыя пастронкі, збруя ўся змазана, здалёку здаецца, што новая.

— Маладзец, Нямковіч, новых пяць вазоў зрабіў, коні падрыхтаваў добра!—гаварылі калгаснікі брыгады № 2 і 5. Хутка прыехала брыгада № 1 і 3.

— У гэтым годзе значна лепш падрыхтаваліся да веснавой сяўбы, чым у мінулым годзе. Люба паглядзець,—гаварыў старшыня калгаса Казёл, агледзіўшы ўсе брыгады.

***

Едуць. Уперадзе на буланым «Мальчыку»—кіраўнік калгаса тав. Казёл, за ім стальны конь «інтэрнацыянал», які атрыманы калгасам ў прэмію ў 1929 годзе. Заіграў духавы аркестр. Падводы па пары коней стройна ішлі адна за другой. На вазах ляжалі адрамантаваныя плугі, бароны, спружыноўкі.

У вёсцы старыя і маладыя выходзілі на вуліцу, каб паглядзець на пробны выезд.

Чыталі плакаты, на якіх было напісана: **«Працаваць будзем так, каб наш калгас «Першага Мая» зрабіць большэвіцкім, а калгаснікаў заможнымі». «Павысім ураджайнасць».** «Даб'емся 100 пудоў зернавых і 1000 пудоў бульбы з га».

Пробны выезд паказаў, што калгас «Першае Мая» узорна падрыхтаваўся да веснавой сяўбы. Хоць сёння выязджай у поле.

Увечары калгаснікі абгаварвалі вынікі пробнага выезда, намячалі мерапрыемствы па хутчэйшаму і лепшаму правядзенню веснавой сяўбы.

Слуцкі раён. **Кучур**

Светлы дзень майго жыцця

Мой вытворчы стаж—25 год. І ніколі я не адчувала такой радасці, як ў той дзень, калі мы ішлі на завод імя Варашылава забіраць пераходны сцяг. Сцяг у нас і будзем трымаць яго моцна.

Мы з гонарам заяўляем калектыву «Варашылава»—не змаглі трымаць, прахлопалі. Дрэнна працавалі, не выканалі сваіх абавязкаў. Зараз сцяг папаў у моцныя рукі. Калі ў капіталістычных краінах за чырвоны сцяг дзесяткі тысяч—цвет пролетарыята гніе ў засценках, асуджаецца на вечныя катаргі, то ад нас будаўнікоў соцыялізма патрабуецца зусім маленькая ахвяра: працаваць так, як патрабуе другая пяцігодка—арганізаваць сваю работу культурна, выконваць промфінплан і даваць высокую якасць прадукцыі. На гэта мы здольны. І конкурс, абвешчаны трыкутнікам фабрыкі на заваёву першынства ў соцспаборніцтве паміж цэхамі, мы поўнасцю адабраем і абавязуемся ўмовы выканаць. Сцяг будзем трымаць моцна.

Менск, фабрыка «Комунарка» **Шымановіч**

Іг. ЛУЦКЕВІЧ

АГНІ ОВІЕДО*

* * *

Бойкі прадстаялі вялікія і жорсткія. Пачынала днець. Збоку парта Хіхонэ зноў пачалі з'яўляцца ўрадавыя войска, бронемашыны і авіяцыя.

Абарона горада патрабавала ад партыйнага камітэта і рэўкома няўтомнай энергіі і зоркасці да ўсіх момантаў і дробязей баявой арганізацыі. Тым больш, калі ўпотайкі збіраліся капіталістычныя групкі фашысцкіх галаварэзаў. Яны рыхтавалі ўдар у спіну — нечаканы і раптоўны. Старыя анарха - сіндыкалісты, акапаўшыся ў профсаюзах, не пайшлі далей забастоўкі, яны спыніліся толькі на эканамічных патрабаваннях, ад узброенага паўстання яны адмовіліся і пахаваліся ў хатнія куты.

Але рабочыя пайшлі за камуністамі, яны як адзін сталі ў рады рэволюцыйных атрадаў. За імі пайшла і моладзь. Асаблівай адвагай вызначаліся бястрашныя вуглякопы з даліны Лангрэо, якія разам з жонамі прышлі заваёўваць Овіедо—сталіцу Астурыі. Іх налічвалася каля 7.000 чалавек разам з жанчынамі.

Раптам за чыгункай з боку вакзала пачулася перастрэлка. Два гідрасамалёты, якія прыбылі з Хіхонэ, скінулі над вакзалам некалькі бомбаў і хутка зніклі.

Насоўвалася трэцяя ноч.

Віолета Арэніо была на сваім месцы. З нейкай асаблівай бадзёрасцю, яна паспявала быць у дактароў, наладжваць іх дзяжурствы ў шпіталі і даглядаць параненых. Яна арганізоўвала жаночыя дружыны на пашыўку бялізны, а дзяцей—на збор прадуктаў. Гэтая клапатлівасць Віолеты адчувалася ва ўсім.

Параненыя прыбывалі. За вокнамі грукацела барацьба. Трэба было быць гатовымі да бою ў любы час дня і ночы. У рэўкома ёсць некалькі гармат і кулямётаў, але не хапае кулямётных стужак. Віолета зараз-жа ідзе ісклікаць жанчын на дапамогу. І жанчыны ідуць. Цэлую ноч працуюць яны на зброевым заводзе, рыхтуючы кулямётныя стужкі.

Пасля жорсткага боя, які цягнуўся ўсю ноч, людзі, нарэшце, паспелі раніцой перадыхнуць. Празрыста-шызыя воблакі ўзняліся вышэй гор. Пачынаўся дзень. Якім прасторам дыхала неба! Якім прывольным быў дзень свабоды. У Овіедо, што час прыбывалі дэлегаты з суседніх гарадоў і вёсак з весткамі пра захоп улады ў рукі рабочых, а надвечар гэтага-ж дня адбылося першае пасяджэнне рэўкома Астурыі. У зал пасяджэнняў убег Мальвей Гомуно, разумны, адчайны хлапец. Ён упэўніваў і патрабаваў ад рэўкома:

— Дайце атрад мне! Нельга пакідаць войскі ўраду каля нашага горада! Трэба адкінуць іх.

Але зрабіць гэта нельга было. У рэўкома меліся весткі аб новых вылазках ворага і трэба было сабраць усе сілы для адпора. Ахалоджаны такім адказам Мальвей Гомуно сумна пакінуў зал паседжання рэўкома.

Насоўвалася ноч чацвертая. Чорнаю хмараю навісла ноч над горадам. З трох бакоў адразу неба прарэзалі шырокія, бліскучыя праменні пражэктараў. Яны ўткнуліся ў плошчу перад рэўкомам над вакзалам і зброевым заводам. Пражэктары бегла абмацалі рэволюцыйны горад і зніклі ў цемры.

Віолета не спала ў гэтую ноч. Яна ізноў сустрэла таварыша з парткома, якога некалі падняла на дэманстрацыі з перабітай нагой і дапамагла яму. Зараз ён знаходзіўся на папраўцы ў шпіталі, але мог ужо хадзіць. І вось яна седзючы каля яго ложка слухала яго расказ аб сабе. Сын рэволюцыянера—эмігранта, які ўцёк з царскай Расіі і канчаткова асталяваўся тут. Зараз добра валодае іспанскай мовай. Але ёй было дасадна, што ён не можа дакладна расказаць аб Октябрскай рэволюцыі ў Расіі, у якой ён сам на жаль не ўдзельнічаў.

Дакладна ў чатыры гадзіны ночы над горадам ізноў забегалі праменні пражэктараў. А праз пяць хвілін уздрыганулі сцены, пасыпалася шкло і неба запалілася бязлікімі агнямі. Над горадам узрываліся снарады, асыпаючы вуліцы градам шрапнелі. Недзе далёка застукалі кулямёты. У змрочнай вышыні гудзеў самалёт. Бойка разгаралася. Пад градам куль і шрапнелі гераічна змагаліся рудакопы Лангрэо... Іх вопытны важак,—забойшчык Бласко Вальган, з якім плячо ў плячо змагалася і яго жонка, разлічыў ход боя. Захоўваючы свой атрад ён загадаў адступаць не спяшаючы.

Раптам, амаль у самым цэнтры горада, ля будынка тэлеграфа, падобныя на стук більярдных шароў, прагучэлі ўзрывы ручных гранат. Рэшткі мясцовых фашыстаў, якія хаваліся ў горадзе, ударылі з тылу. Ліквідаваць гэтую правакацыю даручылі таварышу з партыйнага камітэта, які толькі што вышаў са шпіталя.

Але вось з'явілася некалькі аэрапланаў. Пачалася шалёная бамбардыроўка. Так наважыў генерал Дон-Очоа, крыважэрны патомак іспанскіх інквізітараў.

Бомбы падалі з цяжкім земляным уздыхам. Неба стагнала ў сударагах. Людзі ішлі, нагібаліся, падалі, уставалі і зноў беглі. Усе чалавечыя пачуцці расталі, быццам іх і не было. Засталося адно: ярасць барацьбы. Усе перажыванні, якія маланкай праносіліся ў галаве, плавіліся на ляту і зліваліся ў адно: ярасць барацьбы.

У гуле бамбардыроўкі горад быў запален снарадамі. Праз палаючую смалу па вуліцы праляцеў бранявік і шыны, ахопленыя полымем, круціліся ў гарачай смале.

Дзіка растрэпанае неба хісталася ў разрыве хмар. Грымела навальніца. Лівень агня, лівень дажджу і струмені крыві стамілі паўстанцаў. Яны адступалі ў горы. Але вуглекопы ўсё яшчэ ўпарта ўстрымлівалі наступаючыя войскі, чакаючы калі паведамяць аб эвакуацыі шпіталя.

Цяпер усе мужчыны былі на лініі боя, у тыле заставаліся адны жанчыны. Яны самі ўпраўляліся з коньмі, вывазілі абоз з

* Пачатак гэтай гадзі ў №№ 1 і 2 нашага журнала.

харчаваннем, пераносілі параненых у фургоны і разводзілі дзяцей па хатах.

Дождж перашкодзіў войскам правесці артылерыйскі абстрэл адступаўшых. Адстрэльваючыся ад наступаўшай пяхоты паўстанцы адыходзілі за горад, у горы.

Да вечара горы ператварыліся ў крэпасці, а перавалы і скалістыя стромы—у фарты.

* * *

Пасля бойкі і пасля дажджу надыйшла цішыня змрочнага вечара. Горы агарнуліся туманам, стамлёнасцю, цішынёй... Людзі ўкладваліся адпачываць, не выбіраючы сабе аблюбаваных пагурачкаў, далінак, а тут-жа на месцы, бліжэй да ўсіх.

Альвар для сябе абраў невялікую катлавіну за ўзвышаным краем скалы пад высокай каранастай сасной. Адсюль быў поўны абгляд праціўніка. Перад Альварам прасціраўся горад, бліжэйшыя сёлы і рэчка.

Злева за чыгункай падымалася ўзгор'е, дзе толькі што грукацела бойка.

Пакуль не зусім звечарэлася, Альвар наважыў абыйсці лагер, агледзець людзей, пабачыць сяброў, а таксама склікаць партыйны камітэт і ўсіх важакоў на совет.

Стамлёныя байцы ляжалі ў разнастайных позах. Альвар падыходзіў да сядзеўшых, гутарыў з імі, пытаўся аб баявым адчуванні:

— Нічога,—адказвалі байцы. Нам толькі адпачнуць, а там мы ім пакажам.

Тут-жа ў баку, каля самага абрыва Альвар угледзеў жонку Вальгана, адну з самых адважных жанчын сярод паўстанцаў. Яна нахілялася, нешта разглядваючы за абрывам. Ён падышоў да яе.

— Эльвіра, а вы чаму ў баку? Дзе Бласко?

— Ды вось мой ваяка справу сабе прыдумаў.

— Якую справу?

— Люльку згубіў. Сядзелі тут, а ён завёў песню ды забыўся, што люлька ў роце... Ну, вось і шукае.

Знізу да Альвара даносілася басістая прыпеўка:

Біба-рамба, біба-рамба
Біба-рамба, уль-люлю...

— Знайшоў відаць,—адказала Эльвіра.

— Ну, няхай. Толькі скажыце яму... Вось дрэва... Няхай прыдзе на совет, прагаварыў адыходзячы Альвар.

У абкружэнні скалістых выступаў, на зялёнай пляцоўцы раскінуліся фургоны шпіталя. Крышку далей акапалася кухня, над якой віўся шызы дымок. Угледзіўшы поблізу Віолету, Альвар накіраваўся да яе.

— Ну, як на тваім фронце, Віолета?

— Усё ў парадку. Вось з вячэрай упраўляюся...

— Ну, ну. Ты ў нас клапатлівая,—згадзіўся Альвар.

Пасля раздачы вячэры параненым і хворым, зашумеў увесь лагер. Па сігналу людзі пацягнуліся да катлоў з гарачым варывам. Павесялела. Запаліліся кастры. Навакол іх байцы разсаджваліся вячэраць. Тут-жа поблізу, на зялёных пляцоўках пасліся коні.

— Фуража ў нас мала, а хутка пойдуць халады. Трэба запасціся аўсом і сенам,—спакойна прагаварыла Віолета.

— На совеце абмяркуем. Прыходзь. У нас яшчэ цэлы рад пытанняў,—паведаміў Альвар і папрасіў Віолету скласці разам з камандзірамі атрадаў спісы выбыўшых са строя. На развітанне Альвар яшчэ напомніў аб зборы і накіраваўся да ўзгор'я, дзе яму выпала некалькі хвілін быць аднаму. Адсюль ён глядзеў у змрок на раскіданыя аганькі пакінутага горада. Колькі іх блішчыць у змроку! Гэта проста маленькія, бліскучыя кроплі крыві. Гэта сэрцы рабоў гараць у змроку. Сярод каменнай грамады горада, пабудаванага рукамі рабоў, у мізерных хібарках гараць іхнія сэрцы.

Дзіўны, прыдушаны гук даляцеў да Альвара. Можа аступілася казуля і паляцела ўніз на пагібель?.. Можа падкрадваецца хто?.. Альвар стаяў і слухаў цішыню.

Тут у гарах Астурыі, у высокіх Кантабрыйскіх гарах правёў ён усё сваё дзяцінства і юнацтва. Дзесяць гадоў цясаў граніт. Чорт ведама, колькі цясаў...

— Марыш... Адсырэў крышку,—раптам за спіной Альвар пачуў голас Віолеты.

— Не тое, каб адсырэў, я так... падумаў крышку, як доўга камянеў. Сябе не ведаў,—адказаў Альвар.

— А зараз, ведаеш?

— Разам з усімі, ведаю.

— Правільна... Гэта бывае,—згадзілася Віолета.

Гэтым часам пад сасну на ўзгор'і пачалі зыходзіцца людзі на совет. Віолета запісвала прысутных. Сабраліся амаль усе, не далічыліся толькі дваіх. Адзін—той, каго называлі таварышам з партыйнага камітэта, другі—важак атрада рудакопаў.

Альвар адчыніў паседжанне совета. Віолета паведаміла лічбы забітых, хворых і параненых. Альвар паведаміў аб становішчы лагера. Не хапала агнепрыпасаў. Пытанне стала дужа востра. Трэба было здабыць агнепрыпасы, чаго-б гэта не каштавала. Віолета, як начальнік эвакуацыйнага атрада, прасіла вылучыць таварыша для вылазкі за агнепрыпасамі. Альвар Рыволье прасіў Совет на гэтую справу паслаць яго, астатніх байцоў да яго вылучаць камандзіры атрадаў.

Так і было вырашана советам.

Не трацячы ні хвіліны, Альвар адразу-ж прыступіў да падрыхтоўкі вылазкі ў горад. Сабраўшы байцоў, ён растлумачваў заданне:

— Апоўначы мы спусцімся ў даліну. Але раніцой, таварышы, атрады трэба развесці па ўзгор'ях—ланцужкамі. Можна чакаць рознага. Знішчальным будзе для нас, калі мы будзем разам, палёт самалётаў. І покуль важакі атрадаў падбіралі для Альвара байцоў, ён яшчэ раз абышоў вартавыя пасты лагера.

(Працяг будзе).

Выданне ЦК КП(б)Б Ч. в. а. адказнага рэдактара М. І. ВОЛГІНА

Адрас рэдакцыі: Менск, Совецкая, 63, 3-ці паверх, 11-ты накой. Тэл. 22-415

Друкарня ім. Сталіна. Заказ № 139. Тыраж 13 860. Галоўлітбел № 2842.

Здана ў набор 12-II—35 г. Падпісана да друку 25-II—35 г. У нумары 2½ арк. 120.140 друк. знакаў.